Галіна Кіслая ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Аляксандр Харкевіч ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 16 (2710) Год LIII | Беласток, 20 красавіка 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Праблемы з аўтарытэтамі

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Праўдападобна, калі выйдзе гэты нумар „Нівы", будзем ужо ведаць рашэнне Сабора ў справе айца Гаўрыіла, былога архімандрыта Супрасльскага манастыра. І, праўдападобна, сёлетні Вялікдзень у манастыры людзі сустрэнуць у слёзах і смутку. А сам закалот з назначэннем у епіскапы выкліча непатрэбныя эмоцыі вернікаў.

Прыгадайма, 7 красавіка г.г., у дзень Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы, айцец Гаўрыіл папрасіў Сабор не павышаць яго ў епіскапы. Сваё рашэнне аргументаваў так:

— *Я яшчэ не гатовы прыняць такі адказны і прэстыжны сан.*

Заява айца Гаўрыіла паказалася настолькі сенсацыйнай, што яе агучылі з першых старонак усе беластоцкія штодзённікі. У першую чаргу гаварылася пра сувязь былога архімандрыта з парафіяй. Сапраўды, цяжка знайсці ў нас духоўнага з такім вялікім аўтарытэтам. За лекарскай і духовай парадай едуць да яго не толькі праваслаўныя, але і ярыя беластоцкія каталікі, якія ў гэтым месцы пачынаюць думаць пра экуменію...

Мне самой прыходзілася пачуць сярод народу легенды пра дабрадзействы архімандрыта: „Ён і не есць, не спіць — усё за хворых моліцца. І кожнага выслухае, для кожнага добрае слова мае!"

Доказам гаспадарскіх талентаў былога архімандрыта з'яўляецца матэрыяльнае адраджэнне Супрасльскага манастыра. У першую чаргу трэба назваць адбудову ўзарванай немцамі ў 1944 годзе старажытнай лаўры. У апошніх гадах манастырскія будынкі прайшлі рамонт, былі закладзены агароды. Дзякуючы яго энергіі ўзнік Музей ікон — адзін з найбольшых турыстычных атракцыёнаў рэгіёна. Айцец Гаўрыіл ангажаваўся таксама ў праект Супрасльскай акадэміі, якая ставіць сабе за мэту папулярызацыю ведаў аб праваслаўі ў Польшчы ды не толькі.

На падтрымку і зразуменне маглі разлічваць і беларусы-патрыёты. Манастырскі хор выконвае не толькі царкоўныя творы — у іх рэпертуары многа беларускіх народных песень. У час царкоўных і народных мерапрыемстваў харысты выступаюць у народных беларускіх касцюмах. А сам айцец Гаўрыіл у час начной багаслужбы ў катакомбах прамаўляе да верных па-беларуску або дакладней: на сваёй сакольскай гаворцы. Ён, як і большасць нашых святароў, ганарыцца сваім паходжаннем і прывязанасцю да людзей, з якіх выйшаў.

Дык у чым тут праблема?! — падумае чытач. — Чаму назначэнне ў епіскапы замест радасці выклікала прыгнёт і хваляванне ў парафіі? Прытым усе парафіяне і сам архімандрыт спадзяваліся гэтага павышэння...

Праблема ў тым, што згаданае павышэнне звязанае адначасова з перасяленнем. Супрасльскага архімандрыта, якога наш народ называе душой Супрасльскага манастыра, накіравалі на Лэмкаўшчыну. 1 красавіка калі ў свет пайшла інфармацыя, што а. Гаўрыіла назначылі Горліцкім епіскапам, запанаваў агульны недавер. „Як гэта, — пыталіся людзі, — чаму архімандрыта праганяюць на Украіну?"

Адначасова новым намеснікам Супрасльскага манастыра Сабор назначыў Бельскага епіскапа Грыгорыя — асобу з вялікім аўтарытэтам, якога таксама не хочуць адпусціць бяльшчане.

З нашых крыніц вядома, што сам а. Гаўрыіл спачатку змірыўся з рашэннем Сабора. На адмоўнае рашэнне паўплываў аднак кантакт з новымі вернікамі-лэмкамі. Горцы паставілі справу ясна: ім патрэбны епіскап украінец.

У размове з „Нівай" а. Гаўрыіл пракаментаваў усю сітуацыю адным сказам:

— *Трэба быць з народам!*

І самая верагодная версія такая, што неўзабаве назначаць яго архімандрытам мужчынскага манастыра ў Яблачыне або ў Саках.

Архімандрыт Гаўрыіл (у міры Юрый Гіба) нарадзіўся 24 ліпеня 1962 года ў Саколцы. Дзяцінства і маладыя гады правёў у вёсцы Вярхлессе. Быў першым манахам, якія пасяліўся ў Супраслі пасля 72 гадоў небыцця манастыра. У манахі быў пастрыжаны ў 1986 годзе і атрымаў імя Гаўрыіл у гонар Архангела Гаўрыіла. У 1999 годзе быў назначаны архімандрытам і адначасова настаяцелем Супрасльскай парафіі. Год таму абараніў доктарскую дысертацыю ў Хрысціянскай тэалагічнай акадэміі ў Варшаве.

Электрычнае крэсла ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Белае і чорнае. Беларусь і Чарнобыль. Пра чарнобыльскую бяду вельмі шмат сказана ды напісана. Але па сутнасці не сказана і не напісана нічога. Ніхто не можа сказаць дакладна, колькі людзей загінула з-за нябачнай радыеактыўнай смерці, і колькі яшчэ загіне. Стаяць пустыя, пакінутыя людзьмі вёскі, стаяць як манументы і напамін. Толькі на Беларусі іх практычна ніхто не бачыць...

За блакітным морам ☞ 2

Ежы ПЛЮТОВІЧ

У мастакоўскай кавярні царыў спакой на падабенства спакою смерці. Бясшумна рухаўся бармен за цьмянай стойкай, а яго твар падобны быў на маску старагрэчаскага трагіка...

НЕВЕРЛІ зноў у Белавежы ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

З бульбай у гербе. Беларускі смак ☞ 5

Міра ЛУКША

У Ляўкове ляпілі „буслінную лапу" ☞ 12

Ілона КАРПЮК

9 770546 196000

Электрычнае крэсла

Белае і чорнае. Беларусь і Чарнобыль. Пра чарнобыльскую бяду вельмі шмат сказана ды напісана. Але па сутнасці не сказана і не напісана нічога. Ніхто не можа сказаць дакладна, колькі людзей загінула з-за нябачнай радыеактыўнай смерці, і колькі яшчэ загіне. Стаяць пустыя, пакінутыя людзьмі вёскі, стаяць як манументы і напамін. Толькі на Беларусі іх практычна ніхто не бачыць. Відэакамера дзяржаўнага журналіста не адважваецца паказаць гэтыя пейзажы грамадству, бо зараз беларуская ўлада занятая нечым іншым. На поўным сур'ёзе абмяркоўваецца мажлівасць будаўніцтва на тэрыторыі нашай радзімы атамнай электрастанцыі.

Кажуць, што яна будзе не такой, як чарнобыльская, толькі нашмат магутнейшая. Ужо калі рване, дык рване. Пустых вёсак не будзе. Іх знясе з зямлі ў адно імгненне, як карова языком зліжа.

Кажуць, што гэтая не ўзарвецца. Але ж і пра тую не папярэджвалі, што гахне. А яна гахнула. Ёй усё роўна было, папярэджвалі людзі адзін другога пра мажлівасць трагедыі, ці наадварот, сцвярджалі, што яна, тая трагедыя, немажлівая. Ёй да людзей не было аніякай справы. Як і тым людзям, якія прынялі рашэнне яе паставіць.

А яшчэ гавораць, што такіх станцый у Францыі навалам. І не ўзрываюцца яны. Лепш за ўсё на гэта адказаў адзін дзядок, які ў Гродне працуе качагарам у адной з кацельняў.

— У Францыі, — кажа ён, — таксама як і ў нас, ёсць і кацельні, і качагары. І кацельняў тых мільёны. І не ўзрываюцца, бо яны ў Францыі. А мая кацельня ўжо тры разы ледзьве мяне на той свет не адправіла. Думаю, нашая атамная станцыя ад французскай будзе гэтак жа розніцца, як і нашы кацельні.

На беларускай зямлі атамныя станцыі ўжо будавалі. Былі такія праекты пры саветах, але пасля выбуху ў Чарнобылі вырашылі, што з беларусаў і адной станцыі з мірным атамам хопіць. Пашкадавалі беларусаў нават бальшавікі, якія нікога і нічога не шкадавалі. На гэты раз, пабачыўшы жахі чарнобыльскай трагедыі, смерць і хваробы, пакуты і паламаныя лёсы, пашкадавалі людзей.

А зараз кажуць, што няма выйсця. Трэба будаваць той атам. Маўляў, току мала. А рускія дорага хочуць за тыя 220 вольтаў. А дзе грошы ўзяць? Праўда, ёсць людзі, ды людзі разумныя, з дыпломамі і навуковымі званнямі, якія сцвярджаюць, што атамная станцыя значна менш прынясе грошай, чым калі яе не будзе. Запэўніваюць, што зямля наша унікальная. Лясы, балоты, прыгажосць усякая. Сюды не тое, што турысты папруць і самі прынясуць тыя замежныя грошы для закупкі току, нафты і закускі, але і буйныя фірмы інвестыцыі пачнуць укладваць. Панабудуюць кавярняў, гатэляў, дарог ды ўсялякай усялячыны. Але пад бокам атамнай станцыі ніхто нічога будаваць не стане.

Ды дай толькі эканамічныя свабоды, беларусы і без замежнікаў усяго набудуюць самі. Але ж не. Вырашылі, што лепш АЭС, чым эканамічныя рэформы. Ды і турысты пакуль на Беларусь не спяшаюцца. Каб яны сюды папёрлі з грашыма, трэба хіба не толькі гатэлі памяняць.

Вось, прыкладам, амерыканцы, таксама раней злоўжывалі здабываннем энерганосьбітаў. А пасля бачаць, што нешта не так пайшло. Эканоміка перастае развівацца. Усе толькі энергію і здабываюць, а больш нічога не робяць. Дык яны нават свае свідравіны з нафтай замарозілі і не ўзялі адтуль ані грама нафты нават падчас вайны ў Іраку. Яны добра ведаюць, што купляць энергію больш выгадна, чым яе прадаваць.

У нас жа працягваюць думаць па-савецку, гігантаманна. Маўляў, панабудуем монстраў, а там і камунізм не за гарамі. Толькі жыць, чамусьці, лепш з тых будоўляў не станавілася. А монстры, час ад часу, мелі тэндэцыю ўзрывацца. Так як чарнобыльскі монстр імя Леніна.

А можа ўсё зусім не так. Можа тыя, хто задумаў будаўніцтва атамнай станцыі на Беларусі толькі радуюцца, калі мы пішам пра яе, параўноўваем з Чарнобылем, абмяркоўваем мэтазгоднасць такога будаўніцтва, разлічваем выгадна гэта ці не, колькі той ток каштаваць будзе. А станцыя ў гэты час будзе будавацца зусім не дзеля току. Але ў кожным выпадку, дзеля чаго б яе не будавалі, можа атрымацца чарговае электрычнае крэсла. І нібыта гэта нават добра, калі крэсла ёсць, але сядзець на ім чамусьці страшнавата.

Віктар САЗОНАЎ

За блакітным морам

У мастакоўскай кавярні царыў спакой на падабенства спакою смерці. Бясшумна рухаўся бармен за цьмянай стойкай, а яго твар падобны быў на маску старагрэчаскага трагіка.

— А ты ўсё з'яўляешся аматарам, значыць, ахвярай гэтай гніючай, выпетранай Еўропы, — паэт-постмадэрніст спаглядаў на мяне з кплівай ухмылкай, як заўжды самаўпэўнены, з берагамі напоўнены тою непахіснай пэўнасцю, якую не здзярэш, той перакананасцю ва ўладанні абсалютнай ісцінай. — Мусіш на сябе зважаць, дбаць аб сябе, таму што гэтая распадаючаяся падла можа цябе яшчэ больш балюча брыкнуць перадсмяротным выспяткам.

А я ўглядаўся ў святло, што прачыналася за акном кавярні ў перадпаўдзённы час, не мяшаў яму ў гэтым маналогу, не спыняў яго, слухаў.

— Будучыня нашага свету належыць Азіі, культурам Далёкага Усходу. Ты глянь толькі, у якім маланкавым тэмпе развіваюцца Кітай або Індыя: мы, еўрапейцы, мелі іх у пагардзе, ставіліся да іх зняважліва, а яны сёння выраслі на эканамічныя імперыі, глабальныя магутнасці. Сёння Захад, Еўропа не мае нічога каштоўнага ў прапанову для рэшты свету. Наша еўрапейская цывілізацыя боўтаецца ў геданізме, у распусце, у волі, якая разумеецца як права на неабмежаванае раздолле, прымітыўная забаўка. Культура Захаду цяпер у застоі, у крызісе. Дажываюць свае дні апошнія цудоўныя старцы-інтэлектуалы, у час калі іх наследнікі, нейкія недаросткі, малыя, занятыя дзяльбой воласа на чвэрткі, занятыя прадукцыяй каментарыяў да чарговых каментарыяў. Тым часам як жа квітнее, якімі свежымі тонамі гучыць Усход — хоць бы ягоныя будызм, індуізм, канфуцыянства. Еўропа застрагла ў аковах гэтага клятага прагрэсу, нічога няўмоўных здабыткаў тэхнікі, модных фінціклюшак, гразне ў аковах еўрапейскага схематычнага часу, які з'яўляецца лініяй, уздымаючайся ад мінулага праз цяперашнясць да будучыні.

Я маўчаў, узіраўся з цікаўнасцю той мысленнай уяве, якую выклікаў мой суразмоўца. Хацелася мне запратэставаць, запярэчыць, але я не пратэставаў. Хацелася адказаць, што няварта нам, цэнтральным еўрапейцам, шукаць сяброў далёка, там, за морам, за небакраем Еўропы, што гэта экзатычныя саюзы, сяброўствы, а на гэтую нашу сімпатыю неабавязкова гэтыя далёкія народы адказваюць узаемнасцю.

— Чым з'яўляецца еўрапейская гісторыя, тая фатальная, — сарваўся з лавы паэт, — той шэраг пакут, бунтаў, паўстанняў і войнаў; падвалаў інквізіцыі, у якіх мучыліся ерэтыкі, кастроў, на якіх палалі ведзьмы, фальшыва абвінавачаныя ў чарах. А еўрапейскія войны былі захопніцкімі, грабежніцкімі, прынеслі прыніжэнне падбітым народам, каланізатарства, генацыд. Ці нам выпадае хваліцца такой спадчынай, лічыць яе скарбам вартым выратавання?

А я маўчаў, смактаў піва са стройнага куфля, спазіраў драбінкі пылу, віруючыя ў праменні святла, што падала ад акна на ціхую вулічку. Падумаў я сабе лянiва, у здранцвенні, што гэты асобень, крытыкуючы, праклінаючы еўрапейскую спадчыну карыстаецца ж гэтымі еўрапейскімі правамі на крытыку, на еўрапейскую свабоду і не апасаецца рэпрэсій за гучнае выказванне крытыкі, а ж у іншым месцы крытыка не з'яўляецца жартам, яна там забаронена, караюць за яе бязлітасна. Сутнасцю гэтае еўрапейскае цывілізацыі з'яўляецца якраз гэтая крытыка, заглядванне пад падшэўку рэчаіснасці, праверка праўды, якую лічаць канчатковай, раўнанне, папраўлянне плыні жыцця.

— А чым жа ж ёсць еўрапейская высокая літаратура, мастацтва? — паэтаў голас вырас у крык. — Гэта прадукт, выраб недапасаваных асобеняў, хворых, дэгенератаў, якія бытуюць дзесьці на абочыне грамадства; таму ж іх біяграфіі адбельваюцца, фальшуюцца ў школьных падручніках, каб не дэмаралізаваць юнацтва. Іх творчасць — выраз невытлумачальных рэфлексаў, неўтаймаваных парываў жарсці. У той час, калі мастакі Усходу маюць стыкоўку з абсалютам, з павагай быту, яны дастойныя, гожыя і моцныя, іх жыццё непарыўнае з творчасцю, а творы іхнія прыгожыя, бо перапоўненыя нябесным духам, духам самых важных, канчатковых спраў. Я ў жаху, калі гляджу на грамадства Еўропы — ледзь некалькі індывідаў з расчышчанай свядомасцю ў бязмежжы дзікага, прымітыўнага тлуму.

А я маўчаў, хоць вачыма душы, ва ўнутраным святле ўбачыў гэтых еўрапейскіх мастакоў, пісьменнікаў, пасвараных з сабой і часам, у якім экзістуюць, недапасаваных да сябе і астатняга свету, няшчасных і блукаючых.

(працяг будзе)

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Рамановіч на свабодзе!

Справа беларуса Ануфрыя Рамановіча, часова прабываючага ў Следчым ізалятары ў чаканні судовага працэсу па ягонай экстрадыцыі ў Беларусь — як гэта паўсюдна называецца — ахапляе ўсё большыя кругі. Пасля артыкула ў „Ніве" і пасля паведамленняў Польскага прэсавага агенцтва (за прэс-сакратаром Акруговай пракуратуры ў Беластоку, па заяве якой Ануфрый Рамановіч трапіў у следчы ізалятар і падрыхтоўваецца экстрадыцыйны працэс) справа зацікавіла палітыкаў, да таго з „найвышэйшай паліцы". Сочаць за ёй, між іншым, віцэ-маршалак Сейма Кшыштаф Путра (лідэр ПіС на Падляшшы) ды дэпутат Роберт Тышкевіч (падляшскі лідэр Грамадзянскай платформы), старшыня Парламенцкай групы па справах Беларусі, віцэ-старшыня сеймавай Камісіі замежных спраў. Гэты апошні інтэрвеніяваў асабіста ў міністра юстыцыі Збігнева Цьвёнкальскага. У лісце, які быў перададзены кіраўніку гэтага ведамства, прыпамінае ён тое, на што мы звярнулі ўвагу ў „Ніве", а менавіта, што Ануфрый Рамановіч у 2006 г., апасаючыся пераследу і несправядлівага працэсу, пакінуў Рэспубліку Беларусь, падаў заяву на атрыманне статусу ўцекача, а ягоную апеляцыю на адмоўнае рашэнне старшыні Установы па справах чужаземцаў анулявала на пачатку жніўня 2007 г. Рада па справах уцекачоў. Дэпутат Тышкевіч звярнуў увагу на ангажаванасць Ануфрыя Рамановіча ў апазіцыйную дзейнасць, між іншым на тое, што быў ён супрацоўнікам Аляксандра Мілінкевіча — старшыні Руху „За Свабоду" і падтрымліваў ягоную прэзідэнцкую кампанію ў 2006 г. Варта прыгадаць, што беларускае правасуддзе патрабуе выдачы Рамановіча за быццам бы фінансавыя круцельствы.

Старшыня Парламецкай групы па справах Беларусі звярнуўся да міністра Цьвёнкальскага, каб той асабіста пацікавіўся справай Рамановіча. Напісаў ён: „Прашу таксама звярнуць увагу судовым органам, вядучым справу Рамановіча, на наступныя патрэбы:

— атрыманне поўнай інфармацыі аб захоўванні правоў чалавека і грамадзяніна ў РБ, а асабліва права на справядлівы разбор перад незалежным судом;

— прыняцце пад увагу сведчанняў прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі аб палітычнай дзейнасці А. Рамановіча і звязанага з гэтым фактам пераследу з боку беларускіх улад;

— прыняцце пад увагу рашэння Рады па справах уцекачоў у справе прашэння Рамановіча на атрыманне ў Польшчы статусу ўцекача.

Важным для бягучай сітуацыі арыштаванага Ануфрыя Рамановіча і, мабыць, для іншых беларусаў, якія апынуліся ў падобнай сітуацыі, з'яўляецца тое, што дэпутат Тышкевіч папрасіў міністра таксама „разважыць, ці для выканання дамовы аб юрыдычнай дапамозе паміж Польшчай і Беларуссю з 1994 г. сапраўды неабходным з'яўляецца ў кожным выпадку падаванне польскай пракуратурай заявы на арышт асоб, за якімі беларускія ўлады аб'явілі вышук". І тут дадаў: „Прашу ў гэтым кантэксце прыняць пад развагу ці абгрунтаваным з'яўляецца далейшае знаходжанне Ануфрыя Рамановіча ў ізалятары". На канец адзначыў: „Я перакананы, што Спадар Міністр, вядомы сваёй прывязанасцю да дэмакратычных каштоўнасцей, учыніць усё, каб Ануфрый Рамановіч знайшоў у Польшчы так вельмі чаканую ім справядлівасць".

Калі мы высылалі гэты нумар „Нівы" ў друк, III Крымінальны аддзел Акруговага суда вырашыў неадкладна вызваліць Ануфрыя Рамановіча з арышту і не перадаваць яго беларускаму боку.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Інтэрв'ю

Галіна Кіслая: „Са Слоніма мы пераехалі на Слонімскую вуліцу ў Беласток"

Сяргей ЧЫГРЫН

Сёлета 27 студзеня ў „Ніве" быў апублікаваны мой матэрыял, які называўся „Дырыжор і кампазітар Кастусь Кіслы". У ім я згадаў праваслаўнага і культурна-грамадскага дзеяча беларускага замежжа, рэлігійнага музыкаведа і кампазітара, дырыжора царкоўных і свецкіх хораў Кастуся Кіслага (1898-1980). Пасля публікацыі ў рэдакцыю „Нівы" патэлефанаваў Міхал Артышэвіч і сказаў, што дачка Кастуся Кіслага — Галіна Кіслая жыве ў Беластоку і рэгулярна наведвае царкоўны хор, які дзейнічае пры праваслаўным саборы св. Мікалая. З дапамогай беларусаў Беластока мне ўдалося адшукаць спадарыню Галіну, дамовіцца аб сустрэчы і зрабіць з ёй інтэрв'ю.

фота Сяргея ЧЫГРЫНА

Галіна Кіслая

— ***Спадарыня Галіна, вялікі дзякуй, што Вы пагадзіліся са мной сустрэцца і пагутарыць пра лёс Вашых сваякоў, а таксама пра Вашага бацьку — слыннага беларуса Кастуся Кіслага. Пры напісанні артыкула я меў мала звестак пра Вашага бацьку, можа Вы дапаможаце сёе-тое згадаць і ўдакладніць.***

— Я з вялікім задавальненнем гэта пастараюся зрабіць, але майце на ўвазе, што я маю ўжо 81 год і не ўсё ўжо памятаю, а некаторыя дэталі, факты, лічбы, наогул, магу пераблытаць.

— ***Спадарыня Галіна, раскажыце спачатку пра сябе і Вашу сям'ю.***

— Я нарадзілася ў 1927 годзе ў Слоніме. У Слоніме з'явілася на свет і мая старэйшая сястра Жэня, яна была з 1922 года нараджэння. Жэня ўжо памерла і пахавана на праваслаўных могілках на Выгодзе ў Беластоку побач з мамай і татам. Там захоўваецца месца і для мяне. Са Слонімшчыны родам была і мая мама Лізавета Кіслая. А тата нарадзіўся ў губернскім Калішы. Мама з татам пазнаёміліся ў Слоніме падчас наведвання царкоўнага хору. Яны ўсё сваё жыццё наведвалі праваслаўныя хоры, там спявалі, арганізоўвалі гэтыя хоры, тата пісаў музыку да царкоўных тэкстаў і г.д.

— ***І Вы таксама працягваеце справу сваіх бацькоў?***

— Так, да сённяшніх дзён я рэгулярна хаджу ў беластоцкі праваслаўны Свята-Мікалаеўскі сабор і спяваю ў хоры.

— ***Ці памятаеце Вы слонімскі перыяд жыцця?***

— Не, не памятаю, бо калі мы прыехалі ў Беласток, мне ішоў толькі пяты год. Згадваюцца толькі маленькія слонімскія моманты жыцця, твары невядомых мне людзей і трохі прыгадваецца горад. У 1932 годзе мы прыехалі ў Беласток і з таго часу я ніколі больш у Слоніме не была. Калі са Слоніма мы прыехалі ў Беласток, то жылі на кватэры па вуліцы Слонімскай, 28, а цяпер я жыву на Навагрудскай вуліцы. Як бачыце, мяне, праваслаўную беларуску, Беларусь ад сябе ніколі не адпускала.

— ***Дзе працаваў тады Ваш тата ў Беластоку?***

Кастусь і Лізавета Кіслыя з дачкою Жэняй, пачатак 1930-х гадоў

— У адной страхавой кампаніі. Там пэўны час працавала і мама. Тата быў вельмі адукаваным чалавекам. Але больш за ўсё ён любіў царкву і царкоўную музыку.

Кастусь і Лізавета Кіслыя з дочкамі (злева), астатнія тры асобы невядомыя, 1930-я гады

— ***Спадарыня Галіна, чаму Ваша мама, сястра і Вы засталіся пасля вайны ў Беластоку, а тата адзін выехаў у Германію?***

— Тата ніколі не займаўся палітыкай, ён любіў музыку, ён быў добрым спецыялістам па арганізацыі царкоўных і свецкіх хароў, але адразу пасля вайны за ім пачалі сачыць савецкія спецслужбы і праз пэўны час бацьку маглі б арыштаваць. Каб выратавацца ад арышту, у сям'і было вырашана, каб тата пакінуў Беласток і выехаў тэрмінова ў Германію. Што ён і зрабіў. А з Германіі яго шлях ляжаў у Бельгію і ЗША. Некалькі гадоў мы пра тату нічога не чулі, думалі, што ён дзесьці загінуў. Пасля, я не памятаю, нехта нам паведаміў, што Кастусь Кіслы жыве ў Амерыцы. Потым нам перадалі яго адрас і мы пачалі з ім перапісвацца. А праз пэўны час я наведала яго ў ЗША. Запрашала прыехаць да нас у Беласток, але ён усё баяўся, каб не арыштавалі. Але пасля вайны тата да нас прыязджаў адзін раз у Беласток, трохі жыў з намі. А пасля ў канцы 1970-х гадоў ён прыехаў да нас назаўсёды. А 8 студзеня 1980 года яго не стала.

Кастусь Кіслы (каля машыны) з незнаёмым у ЗША, 1966 год

Кастусь Кіслы ў апошнія гады свайго жыцця, 1979 год

— ***Ці меў Ваш тата ў ЗША іншую сям'ю?***

— Не, тата больш не жаніўся, а мама не выходзіла замуж.

— ***А як у Беластоку склаўся Ваш асабісты лёс?***

— Я жыла тут з мамай і сястрой. Сястра Жэня выйшла замуж, мела двух сыноў. Сын яе жыве ў ЗША, а дачка ўжо памерла. Была ў нас і яшчэ адна сярэдняя сястра, але яна маленькая памерла і пахавана ў Слоніме. Мама пасля вайны прыязджала адзін раз у Слонім на магілку нашай сястры. А больш у Слоніме не была. Што датычыць мяне, дык я жыву адна. Выкладала ў начальнай школе фізкультуру і вяла секцыю па гімнастыцы, бо сама ў маладыя гады займалася гімнастыкай. Вучні мае ўдзельнічалі ў многіх спартыўных спаборніцтвах па гімнастыцы, прывозілі дыпломы і граматы.

— ***А што Вы ведаеце пра сваіх родных дзядзькаў, я маю на ўвазе Аляксандра і яшчэ аднаго роднага брата Вашага таты? У гады вайны Аляксандр Кіслы быў бургамістрам Слоніма.***

— Пра аднаго дзядзьку я нічога не ведаю. А дзядзька Аляксандр пасля вайны жыў у Аўстраліі, быў жанаты, меў сына і дачку. Але з імі я сувязей не маю, магчыма ў гэтым вінавата адлегласць, бо да Аўстраліі ўсё ж вельмі далёка і нам сустрэцца ў жыцці не давялося, хаця з дзядзькам мы перапісваліся і з імі падтрымліваў сувязі мой бацька. І калі ён жыў у нас, то вельмі часта згадваў сваіх родных братоў. А перад самай вайною мы ў іх гасцілі, здаецца, гэта было ў Вільні.

— ***Ці спяваў Вам бацька ў час сустрэчы песні?***

— Спяваў народныя песні і царкоўныя на беларускай мове і на польскай. Мы ўсё ж былі і застаемся праваслаўнымі беларусамі.

— ***А калі памерла Ваша мама?***

— Мама памерла пазней за бацьку. Хачу сказаць, што яны ніколі не сварыліся, мусіць, усё жыццё моцна кахалі адзін аднаго, хоць пражылі больш паловы свайго жыцця ў ростані.

— ***А ці маеце ў сваім хатнім архіве музычны зборнічак Вашага бацькі, які называецца „Вялікдзень"?***

— Не, не маю. Толькі ёсць фотаздымкі, хаця і на фотаздымках я не ўсіх ведаю, дый і многіх не памятаю.

— ***А што сёння часцей за ўсё згадваецца, аб чым думаецца?***

— Хочацца яшчэ трохі пажыць. А душу я сваю лячу царквою, калі прыходжу туды на богаслужэнні і ў царкоўны хор. Хаця, шчыра скажу, старому чалавеку жыць ужо сумна.

Кошт сабакі

Бяздомныя сабакі гэта адвечная праблема, з якою шмат гадоў не прыйшлося ў горадзе Бельску нікому справіцца. Бліснула крыху сонейка, пацяплела і свой дух пачулі каты і сабакі. З катамі малая бяда, дык з сабакамі падумай што зрабіць! Збіраюцца яны ў чароды і вылежваюцца на скверыках або так сабе бегаюць, малыя і вялікія. Пагражаюць яны ўсім, і дзецям, і дарослым, бо калі такая гайня накінецца, дык можа і акалечыць ці хоць напалохаць. Вось перад Энергетычным прадпрыемствам на скрыжаванні вуліц 11 Лістапада і Пілсудскага такая гайня збіраецца. Я пазваніла ўладам горада, ды ў такой сітуацыі ўлады бездапаможныя. Кажуць, што прытулак для сабак перапоўнены, усыпляць звярыну без дайрацыі нельга, а цана, каб аддаць звяра ў прытулак, немалая — тысяча злотых за штуку. Падумайце — калі іх па Бельску бегае столькі, колькі б улады мусілі за іх заплаціць! А дзе ж тут грошай набраць? Есць важнейшыя выдаткі! Цяпер нават за ўласных сабак не трэба плаціць падатку, а калісь плацілі, хоць невялікія грошы. Добра жывецца жыхарам Бельска, калі хапае ім на тое, каб сабак гадаваць! Іншая справа ў вёсцы, калі сабака пільнуе гаспадарку. А ў горадзе — сабачка абрыдне, дык яго прэч на вуліцу! І так ніякага выхаду са справы бяздомных сабак пакуль няма. Можа, знойдуцца свабодныя месцы для іх у прытулку. А цяпер застаецца нам абмінаць іх, каб не пакусалі!

Перакуленыя знакі

Вярталася я вечарам 23 сакавіка з горада і сваім вачам не верыла. Каля былога нямецкага могільніка, што ля вуліцы Белавежскай, ляжыць вывернуты дарожны знак. Падыходжу бліжэй да магазіна ПСС — а тут таксама паваленыя знакі. Далей на скрыжаванні — наступны... Каму яны перашкаджалі? Вось, думаю, каб такога хулігана злавіць і выстукаць па дурной мазгавешцы такімі знакамі, каб назаўжды запамятаў, для чаго ён пастаўлены! Не думае такі, што з-за яго можа быць катастрофа, могуць пацярпець людзі! Перадала я інфармацыю аб знішчаных знаках паліцыі, каб яна паведаміла адпаведным службам.

Жэня МАРТЫНЮК

Чаму так?

Едучы кузаўскай вуліцай у напрамку чыгуначнай Чаромхі, на адрэзку дарогі ад сядзібы Міхася Канарэўскага да мастка на рэчцы Нурэц, можна прыкмеціць непрыемны абразок — раз'еханыя жабы. Такое ж бачыцца і на асфальтоўцы, якая вядзе з-пад паравознага дэпо і асяродка здароўя на станцыю. У пятніцу, 4 красавіка, налічыў я каля дзесяці раздушаных земнаводных жывёлін. Праблема ў тым, што жабы напрадвесні падаюцца з месца на месца ў пошуках вады і гразі. Адкосы над рэчкаю, як і пабочыны вуліцы Каляёвай, парослыя кустамі і альшынай, з'яўляюцца адпаведным месцам для разводу гэтых жывотных. І ў час такой вандроўкі выходзяць яны на асфальтавую дарогу, дзе пападаюць пад колы аўтамабіляў. На маю думку, шафёры вядуць сябе неакурата, паколькі маглі б абмінуць маленькага скакунка, але не хочуць. А ці так быць павінна? Жаба — жывая істота і таксама хоча жыць, тым больш што яна не прычыняе нікому шкоды.

(ус)

НЕВЕРЛІ зноў у Белавежы

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У час паніхіды. Злева ад святара стаяць Яраслаў Абрамаў-Неверлі і Мікола Бушко

Сёлета мінае 105 гадоў з дня нараджэння вядомага пісьменніка і педагога Ігара Неверлі, а ягоны сын, таксама пісьменнік і драматург Яраслаў Абрамаў-Неверлі адзначае сваё 75-годдзе. Абедзве юбілейныя даты сталі ў Белавежы прычынай аб'яўлення 2008 года — годам Неверлі, паколькі гэтая сям'я ў пачатку XX стагоддзя пражывала ў Звярынцы побач Белавежы і цесна была звязана з гэтай мясцовасцю. 5 красавіка на ўрачыстай сесіі радныя Белавежскай гміны прысвоілі Яраславу Абрамаву-Неверлі, пражываючаму зараз у Канадзе, званне ганаровага грамадзяніна Белавежы, а Гміннай публічнай бібліятэцы ў Белавежы — імя Ігара Неверлі.

Урачыстая сесія праходзіла ў мясцовай кіназале з удзелам запрошаных гасцей, сярод якіх былі пісьменнікі згуртаваныя ў творчых арганізацыях і людзі, якія ведаюць абодвух літаратараў. Пасля прыняцця пастаноў па ўшанаванні сям'і Неверлі, сабраныя перайшлі на праваслаўныя могілкі і каля магілы бацькі Ігара Неверлі — Міколы Абрамава, капітана 8 Эстляндскага палка расійскай арміі была адслужана паніхіда. Побач магілы Міколы Абрамава знаходзіцца невялікі, з крыжам і надпісам, помнік Людміле Неверлі.

— Мы з бацькам так і не высветлілі, хто з нашых сямейнікаў тут пахаваны. Магчыма, што гэта магіла самага маладога дзіцяці майго дзеда Язэпа Неверлі, — разважаў Яраслаў Абрамаў-Неверлі.

Ужо аб'явы аб мерапрыемстве ў некаторых выклікалі пытанне, чаму Ігар Неверлі карыстаўся толькі адным прозвішчам, а яго сын Яраслаў перад бацькоўскім ставіць яшчэ ўсходнеславянскае прозвішча Абрамаў. Справа высветлілася пасля паніхіды. Аказалася, што калі Ігар Неверлі дэбютаваў у міжваеннай Польшчы, спачатку падпісваўся прозвішчам Абрамаў. Аднак страх, выкліканы падзеямі мінулага, абставіны, якія склаліся ў Рэчы Паспалітай і пагроза дэпартацыі ў Савецкі Саюз паўплывалі на рашэнне падпісвацца прозвішчам маці — Тэрэсы Неверлі, пахаванай у Кіеве. Ігар Неверлі, выехаўшы на ўсход, у бежанства, не стаяў збоку бурлівых падзей. Некалькі гадоў быў камсамольцам, але, расчараваўшыся ў гэтай арганізацыі, заснаваў у Кіеве сацыял-дэмакратычны гурток, а за выдавецкую дзейнасць быў арыштаваны і прыгавораны да ссылкі на Салаўкі. Уцёк з транспарту і рашыўся вярнуцца бліжэй месца, дзе прайшло яго дзяцінства.

— Калі мой бацька, Ігар Неверлі, рашыўся ўцякаць у Польшчу, за грошы пераправілі яго пад савецка-польскую мяжу і яму ўдалося пераправіцца праз раку Збруч. Аднак бацька не ведаў тады польскай мовы, умеў размаўляць толькі па-руску і таму ў Польшчы палічылі яго савецкім шпіёнам, — расказваў Яраслаў Абрамаў-Неверлі. — Маладога Ігара выратавалі дзядзькі, якія жылі ў Польшчы і працавалі леснікамі. Адзін з іх прыехаў на паліцыю і пасведчыў, што Ігар — яго пляменнік. Калі пасля Ігар Неверлі стаў вядомым польскім пісьменнікам, паўтараў, што самым вялікім скарбам пісьменніка з'яўляецца ягоная біяграфія. Казаў таксама, што спачатку самому трэба нешта перажыць, а толькі пасля можна гэта апісаць. Нездарма гэта гаварыў, паколькі перажыў ён перыпетыі з саветамі, у час вайны пабываў у чатырох канцэнтрацыйных лагерах, прайшоўшы ўсе выпрабаванні з пратэзам на назе.

— Трэба ўспамінаць пра людзей у нас пражываючых, якімі можна ганарыцца і памятаць, што наша зямля багатая ў таленты. Неабходна было запрасіць сына Ігара Неверлі — Яраслава, які не толькі пісьменнік і драматург, але і кампазітар песень, — заявіў старшыня фонду „Царкоўная музыка" Мікола Бушко, ініцыятар года Неверлі, прапанову якога падтрымалі белавежскія ўлады — старшыня Гміннай рады Ян Гвай і войт Альберт Літвіновіч.

Удзельнікі ўрачыстасці не адзін раз спасылаліся на мінулае сям'і Неверлі і падзей звязаных з Белавежай і яе наваколлем. Мікола Абрамаў хутчэй за ўсё ў час палявання, наладжанага ў 1900 годзе ў Белавежскай пушчы, пазнаёміўся з Тэрэсай, дачкой маравяніна па паходжанні Язэпа Неверлі, які быў тады вялікім лоўчым цара Мікалая II і, пераехаўшы ў Белавежскую пушчу са Спалы, жыў у Звярынцы. Пасля маладыя пажаніліся і ў 1903 годзе нарадзіўся сын Ігар, які сваё дзяцінства правёў у Белавежскай пушчы. На жаль, у Звярынцы не захаваўся дом, у якім жыла сям'я Неверлі, а і ва ўспамінах звычайных жыхароў Белавежы не захавалася жывая памяць аб родзе, з якога выйшлі пісьменнікі.

— У маёй сям'і ніхто не ўспамінаў пра сям'ю Неверлі. Гэтым родам пачала цікавіцца наша інтэлігенцыя, якая ўжо з кніжак даведалася аб пісьменніках, — заявіў адзін з удзельнікаў урачыстасці, ураджэнец Белавежы.

Мікола Абрамаў памёр у 1910 годзе, а бацька ягонай жонкі, славуты белавежскі лоўчы Язэп Неверлі — у 1914 годзе і пахаваны ён на праваслаўных вольскіх могілках у Варшаве. У час дыскусіі напаміналася таксама пра гульню Ігара Неверлі з царэвічам Аляксеем, сынам цара Мікалая II, які таксама прыязджаў у Белавежу.

— Я не ведаю як сям'я Неверлі трапіла ў Варшаву, але вядома, што пасля Ігар Неверлі адправіўся са сваёй сям'ёй у бежанства, — паінфармаваў Пётр Байко, вядомы і нашым чытачам гісторык-краязнавец, які таксама пацвердзіў, што будынак у Звярынцы не з'яўляецца домам, у якім жылі Неверлі. Мікола Бушко ўдакладніў, што сям'я Неверлі пераехала з Белавежы ў Варшаву хутчэй за ўсё з-за патрэбы лепшай адукацыі сваіх дзяцей. У Варшаве доўга жыў таксама, вярнуўшыся ў Польшчу, Ігар Неверлі і яго сын Яраслаў, але гэта Белавежа звярнула ўвагу на пісьменнікаў. На мерапрыемства, наладжанае ў галоўным Радай Белавежскай гміны і Фондам „Царкоўная музыка" з Гайнаўкі, была падрыхтаваная багатая праграма. Апрача гміннай сесіі наладжаны быў літаратурны сімпозіум „Памяці Неверлі". З цёплымі словамі і дакладамі выступілі літаратары і знаёмыя сям'і Неверлі. Януш Тэрмэр гаварыў аб творчасці Ігара Неверлі, а Яўген Кабатц напомніў, што Ігар Неверлі быў пісьменнікам пагранічча. Пра сувязі Ігара Неверлі са спадчынай Вялікага княства Літоўскага расказаў Адам Паморскі, які таксама звярнуў увагу на вялікае значэнне мясцовай ініцыятывы для пісьменніцкага асяроддзя. Іншыя дакладчыкі гаварылі пра дзейнасць і творчасць пісьменніка. На мерапрыемстве прысутна была Данута Курань, паколькі Ігар Неверлі, выступіўшы з партыі, дапамагаў Яцку Кураню. Апрача першапрэм'ернай прэзентацыі фільма „Асталося з бяседы багоў" сабраныя маглі паразмаўляць з яго рэжысёрам Анджэем Ціткавым.

— У маім фільме (частка тычыцца белавежскага перыяду) выказваюцца людзі, якія ведалі Ігара Неверлі і даследчыкі ягонай творчасці, — заявіў Анджэй Ціткаў. — Часта называюць яго сацрэалістычным пісьменнікам. Мой фільм паказвае, што быў гэта вялікі чалавек ліберальна-левых поглядаў.

Інаўгурацыя года Неверлі закончылася спатканнем з Яраславам Абрамавам-Неверлі ў Цэнтры прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка" ў Гайнаўцы. На месцы, дзе нарадзіўся Ігар Неверлі, прадбачваецца ўстанавіць мемарыяльную дошку ў яго гонар. Інфармацыя пра сям'ю Неверлі будзе даступная ў гміннай бібліятэцы, дзе будуць таксама сабраны кніжкі аўтарства Ігара Неверлі і Яраслава Абрамава-Неверлі.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

З бульбай у гербе. Беларускі смак

Пра беларускі смак можам пагаварыць з сапраўдным знаўцам, вядомым на ўсю Польшчу аўтарам кніжак пра кухню. Андрэй Федарук, якога род выводзіцца з Плютыч, беластачанін, славуты сваімі каляровымі кнігамі пра смакі — і міжнародныя, кавава-гарбатнія смакоцці, і тутэйшыя — крэсавыя ці падляшскія. Смакі разглядае не толькі як практык, але і сацыёлаг. Уключыўся ён у арганізаванне разам з генконсулам Беларусі Тыдня беларускай кухні ў Беластоку.

— Ты ўжо да справы смаку падыходзіш нават як навуковец, — звяртаюся да аўтара-кухара, седзячы, на жаль, у звычайнай кавярні, хоць абое маем надзею рассесціся і рассмакавацца ў якімсьці беларускім шынку ў Беластоку. — Цытуеш Брукнера: *У гісторыі польскай культуры руская не мела б месца, бо яна — асобны тып, калі б не спляліся лёсы абодвух плямёнаў і калі б супольныя ўплывы не адціснуліся так моцна на іх. Калі хочам прадставіць гісторыю польскай культуры, немагчыма абмінуць яе ўсходняга абсягу.*

— Таксама і звычаі, звязаныя са спажываннем і перарабляннем ежы, былі вынікам перамяшчання разнародных усходніх традыцый і культур. Беларуская кухня актыўна ўдзельнічала ў стварэнні міфа крэсавай кухні. Можа не на шляхецкіх і магнацкіх сталах, дзе пераймала старапольскія ўзоры, а наступным чынам і еўрапейскія, але яе месца трэба шукаць у багатай сялянскай кухні. Шматвяковая багатая беларуская кухня з'яўляецца тыпова вясковай. Так як большасць славянскіх кухняў, з'яўляецца кампіляцыяй нацыянальных традыцый і ўплыву кулінарных звычаяў суседзяў. Таксама і суседзі чэрпалі з гэтай кухні поўнымі жменямі. Напрыклад, літоўцы і латышы пазычылі беларускую страву са спецыяльна падрыхтаванай аўсянай мукі, званай *талакном*, а крупнікі і заціркі знойдзем амаль ва ўсіх славянскіх нацыянальных кухнях. Шмат страў польскай, беларускай ці літоўскай кухняў маюць супольныя карані, часам адрозніваюцца толькі назвай: баршчы, верашчака, розныя галушкі... Шмат разоў пыталіся ў мяне, якой з'яўляецца беларуская кухня, якія ў ёй характэрныя стравы. Зводзілі ўсё да страў з бульбы, а дыетэтыкі наракалі на яе тлустасць і цяжкасць.

— Здаецца, сапраўды, бульбашы картоплю любяць найбольш. А каб наесціся, дык з добрай акрасай — без скваркі ды мяса якая ж праца? Патрэбныя калорыі... — мяркую і спазіраю на ўласныя праявы ўпадабання ў беларускую ежу.

— Бульба сапраўды выратавала беларускую вёску ад кашмараў голаду. А калі чалавек пачынае трактаваць харчаванне не толькі як сродак падтрымання жыццёвых функцый? Толькі тады, калі ежы хапае. Тады ў ператваранні і спажыванні можа адлюстраваць свае культурныя і рэлігійныя ўзоры. Жыхары Падляшша таксама выбіраюць бульбу — яна магла б быць нават у нашым гербе! І фактычна, стравы з бульбы характэрныя беларускай кухні, але іх багацце і смакавітасць вырашаюць аб яе каштоўнасці. Доказ гэтаму — арганізаваныя штогод чэмпіянаты свету ў пячэнні бульбяной кішкі і бабкі. А наконт тлустасці страў — сапраўды ў кухні ў вёсцы, дзе трэба нарабіцца ў полі, патрэбная канкрэтная акраса! Стравы рыхтавалі ў печы, у якую ставілі саган са змесцівам, і спажывалася гэта, калі гаспадары вярнуліся з поля. Хто скажа: вось вясковае кухарства, дзе ж яму да тонкай французскай ці італьянскай кухняў! А трэба сказаць, што найбольш вядомыя стравы з гэтых кухняў, як піца, спагеці ці жабы ды слімакі гэта якраз стравы не багацеяў, а нейкія там іхнія фрыкасы знайсці можна толькі ў такіх рэстаранах, дзе звычайнаму хлебаеду ў галаве закружыцца ад цэнаў! А наш шмальчык на пачаканні ці квашаны агурочак як закусь пад кілішак чыстай гарэлкі сёння гэта не мужыцкая ізба, а сталы ў найбольш снобскіх салонах!

Андрэй Федарук з афіцыянткай з рэстарана „Крысталь"

— Беларус любіць з мясам.

— Мяса ў старажытнай беларускай кухні было толькі ад свята. Недахоп бялкоў дапаўнялі стручковымі раслінамі — гарохам, бобам. У некаторых апрацоўках можна прачытаць, што для беларускай кухні характэрныя вегетарыянскія стравы. Ды, здаецца, вегетарыянства гэта свядомы выбар, а не крайнасць. Фактычна, вельмі папулярная была *куляга* — каша з жытняй або пшэннай мукі і з соладу. А вітаміны браліся з рэпы, агуркоў, бручкі, рэдзькі, цыбулі і часнаку.

— Беларусы любяць і мучное.

— Сеяліся здаўна жыта, пшаніца, ячмень, авёс, грэчка і проса. З гэтага, вядома, пяклі перш за ўсё хлеб, аладкі, бліны. Хто першы раз паяўляецца ў Беларусі, здзіўляецца, што хлеб дадаецца і да першага, і да салатаў, і да супоў, і нават да другога, калі нават яно з бульбай. Але таксама хлебам усё закусваюць і іспанцы! Кольскасць хлеба паказвала здаўна на статус сям'і, выконваў ён таксама важную абрадавую і культуратваральную ролю. Хлеб адорвалі вялікай павагай. Ён абавязковы госць на сватах, на хрысцінах, вяселлях і пры іншых важных падзеях. Ды бяднейшыя праслойкі мала ўжывалі хлеба нават увосень, калі „нават вераб'і багатыя". Небагатыя пяклі з жытняй мукі *пірагі*. У экстрэмальных сітуацыях дадавалі ў хлеб змолатыя жалуды, кару з бярозы ці нават молатую кастрыцу. Найбольш распаўсюджаны быў, асабліва ў малаўрадлівыя гады, *хлеб з паловы* — падрыхтаваны з перасеянай паловы грэчкі, аўса або жыта з невялікім дадаткам мукі.

— Прыходзілася беларусам чымсьці замяняць хлеб, які — *дома — валадар, на працы — сябра, у дарозе — таварыш?*

— Пекліся сачні, драчэны (бабкі), скавароднікі. Для іх выпечкі прымянялася жытняя і ячменная мука, часам пшэнная. Скавароднікі звычайна выпякаліся з заквашанага цеста, а танчэйшыя сачні часта рыхтавалі з начынкай — з тоўчанай бульбай, яблыкамі, вішнямі, сліўкамі ці ягадамі. У драчэны дадавалі сыроватку або свежае малако або хлебны, кляновы ці бярозавы квас. Цеста на іх было радзейшае, чым на хлеб. Вельмі часта пяклі прэсныя драчэны — смачныя на працу ў полі ці ў дарогу.

— Цытуеш „смачны" кавалак з Казімежа Барташэвіча, „Лыкі і каўтуны, мемуары падляшскага мяшчаніна". Давай перакладу яго на беларускую мову. „Запрасіў мяне ў гасцінную ізбу, неўзабаве прынеслі шумоўку, аржаны хлеб, масла, сыр, сушаныя грушы і паставілі ўсё на абрус, разасланы на круглым стале з кляпамі, што стаяў пасярод хаты. *Do Wassana, panie Rochu! Bo to gorzałka do śniadania, jak Ojcze Nasz do pacierza* (...). У куце хаты быў комін з аграмаднай печкай, а перад ім цагляная выстаўка, абагараваная ўнутры, якую называюць прыпечкам, на якой сядзела бабка-павітуха, трымаючы дзіця. Пэтро вітаў і не сядаў за стол, а абходзіў гасцей. Мяса ды пірагоў было да волі, быў і класічны крупнік. Хатнія ў другім пакоі ўдзельнічалі ў „празьніку". Далібог, гледзячы на гэты збор прыйшла мне думка — чаго ж то людзі так упарта бегаюць за шчасцем, калі яго можна пакаштаваць так блізка!"

— Па-беларуску гучыць адметна! А я маю для чытачоў „Нівы" прапанову: хачу сабраць ад іх адмысловыя рэцэпты беларускіх страў. Былі б яны падставай для новай кнігі, нашай супольнай, пра беларускія смакі.

З Гайнаўкі і Гайнаўскага павета

Руйнуюць дашкі

Дзве трохсценныя міні-пачакальні на аўтобусных прыпынках гарадской камунікацыі ў Гайнаўцы: адна па вул. Беластоцкай (каля хімічнай фабрыкі) і другая — па вул. Белавежскай (побач кладкі над чыгуначнымі пуцямі над вакзалам ПКП) патрабуюць рамонту ды чарговага малявання. У найгоршым стане знаходзіцца дашок-пачакальня па вул. Белавежскай. З красавіка я ўбачыў там ушчэнт паламаныя лавачку і заднюю сценку. А ўжо брыдкія словы надпісаў на сценах вышэйзгаданых пачакальняў неабходна як найхутчэй замаляваць!

Царскім шляхам

У Гайнаўскім павеце маем штораз больш веласіпедных шдяхоў. Чарговы з іх — назвалі яго царскім — вядзе трактам, які спалучаў Бельск з Белавежскай пушчай. Ён бяжыць з Бельска-Падляшскага праз Відава, Ужыкі, Локніцу, Падрэчаны, Чыжы, Асоўку, Койлы, Новае Беразова і Чыжыкі ў Гайнаўку. У горадзе простая дарога вядзе вуліцай Дольнай, Паддольнай, Стэфана Баторыя ды паварочвае ў вуліцу 3 Мая і адсюль бяжыць проста ў Белавежу.

Важнейшыя сёлетнія інвестыцыі

У гэтым годзе на інвестыцыі ўлады Гайнаўскага павета прызначылі каля 8 мільёнаў злотых. Найбольш на аднаўленне дарог м.ін. з Плянтаў у Нарву (140 тысяч зл.), з Чаромхі ў Ставішчы (1 млн зл.) і з Ласінкі ў Храбустоўку (200 тыс. зл.), на вуліцы ў Гайнаўцы: Верасовую і 11 Лістапада (1,8 млн зл.), на вуліцы ў Белавежы (1,5 млн зл.) ды ў Кляшчэлях на вуліцу Міцкевіча (500 тыс. зл.).

Гайнаўскі павет прафінансуе таксама разбудову дэпо Павятовай камендатуры пажарнікаў у Гайнаўцы (каля 800 тыс. зл.) ды рамонты будынкаў Белліцэя і Комплексу агульнаадукацыйных школ у Гайнаўцы.

У 2008 г. улады горада Гайнаўкі свае фінансавыя сродкі прызначылі на пабудову крытага басейна для плавання (300 тыс. зл.) ды на рамонты Дзіцячага садка н-р 5 і ясляў (200 тыс. зл.). Яны будуць мадэрнізаваць маставыя вуліц Фабрычнай (158 тыс. зл.) і Партызанскай (110 тыс. зл.); таксама пракладуць новыя тратуары на вуліцах Арміі Краёвай, Паддольнай, Мілкоўскага і Касідлаў (85 тыс. злотых).

Небяспечны пераезд

Едучы з Ляўкова ў Нараўку каля вёскі Гарадзіска маем пераезд цераз чыгуначны пуць. Да нядаўна быў ён схаваны за насыпамі зямлі. Лёгка было папасці пад цягнік. У 2006 і 2008 гадах з насыпаў вывезлі частку зямлі і бачнасць на пераездзе значна папраўлася.

Якое ж было маё здзіўленне, калі 3 красавіка г.г. я ўбачыў, што тут зноў насыпалі пяску! Хто гэта зрабіў? Адкажу. Зрабілі гэта працаўнікі ПКП, якія ў сакавіку гэтага года адрамантавалі ў гэтым месцы пуць ды мост на рэчцы Нараўцы. Вось табе і на! Чыгуначны пераезд перад Нараўкай зноў стаў небяспечны, як і быў!

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Шчаслівая трынаццатка

Беларуская мова — як відаць на прыкладзе прадметных конкурсаў, — выдатна падымае прэстыж школ. Вось беластоцкая „чацвёрка”, дзякуючы тром лаўрэатам па беларускай мове (усіх мела 5!) апынулася сярод найлепшых у ваяводстве. У выпадку вясковых школ, як Дубіны ці Нараўка, гэта адзіны шанц, каб заіснаваць сярод найлепшых у рэгіёне. Бо колькасць лаўрэатаў вызначае ўзровень навучання школы. І як заахвочваў новы куратар Ежы Кішкель, лаўрэаты і іх настаўнікі павінны атрымаць яшчэ ўзнагароды ў сваіх школах. Сёння ўсе атрымалі „лаўры” — дыпломы.

3 красавіка ў Пачатковай школе н-р 21 у Беластоку адбылося ўрачыстае падвядзенне вынікаў прадметных конкурсаў для пачатковых школ. У 2007/2008 годзе было праведзеных 8 прадметных конкурсаў па матэматыцы, гісторыі, прыродзе, польскай, англійскай, беларускай і нямецкай мовах. Конкурсы адбыліся на трох этапах: школьным, раённым і ваяводскім. У раённым конкурсе прыняло ўдзел 2346 вучняў, у ваяводскім — 307, а сярод лаўрэатаў апынулася 139 школьнікаў. Найбольш — аж 42 лаўрэатаў вылучылі ў гістарычным конкурсе, 26 асоб — па матэматыцы. **Магдаліна Шаркоўская з ПШ н-р 6 у Беластоку атрымала званне лаўрэата ў трох конкурсах: гістарычным, матэматычным і па англійскай мове.**

Сярод лаўрэатаў конкурсу па беларускай мове апынулася 13 вучняў. Найбольш — бо аж чатыры асобы з бельскай „тройкі”. Па трох лаўрэатаў заваявалі Нарва і Беласток. А вось і прозвішчы шчасліўцаў ды настаўнікаў, якія падрыхтавалі іх да конкурсу. Прозвішчы падаем паводле колькасці балаў, якія набралі лаўрэаты. На першым месцы апынулася **Сара Кос з ПШ у Нарве** (настаўніца Ніна Абрамюк). Далей былі: **Ніна Ваўранюк з ПШ н-р 4 у Беластоку** (наст. Аліна Ваўранюк), **Дар’я Вапа з ПШ н-р 4 у Беластоку** (наст. Аліна Ваўранюк). **Анна Кірылюк з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім** (наст. Міраслава Маркевіч), **Уршуля Беразавец з ПШ у Нарве** (наст. Ніна Абрамюк), **Віялета Маліноўская з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім** (наст. Андрэй Мароз), **Магдаліна Кубай з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім** (наст. Тамара Русачык), **Лідзія Пякарская з ПШ н-р 4 у Беластоку** (наст. Аліна Ваўранюк), **Дар’я Шыманюк з ПШ н-р 6 у Гайнаўцы** (наст. Людміла Грыгарук), **Канстанцыя Ксенія Дораш з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім** (наст. Андрэй Мароз), **Магдаліна Леановіч з ПШ у Дубінах** (наст. Ніна Куптэль), **Уршуля Нікановіч з ПШ у Нарве** (наст. Ніна Абрамюк), **Кацярына Зданоўская з ПШ у Нараўцы** (наст. Ліля Кардаш).

Куратар Ежы Кішкель віншуе лаўрэатаў

Настаўнікі англійскай і беларускай моў. Чацьвёртая злева Ніна Абрамюк, далей Аліна Ваўранюк, Міраслава Маркевіч, Андрэй Мароз і Тамара Русачык

Лаўрэаткі з Беластока: (злева) Ніна Ваўранюк, Ліда Пякарская і Дарка Вапа

Наймалодшай лаўрэаткай з’яўляецца Дарка Вапа, вучаніца чацвёртага класа ПШ н-р 4 у Беластоку. Яе старэйшыя сяброўкі: Ніна Ваўранюк і Лідзія Пякарская ўжо трэці раз запар заваявалі званне лаўрэата беларускай мовы.

Якія прызы чакаюць шчаслівую трынаццатку?

Лаўрэаты атрымаюць шасцёрку на пасведчанні і могуць паступіць у любую гімназію ў Польшчы.

— Дзякуючы конкурсу, вы можаце развіваць свае зацікаўленні, — сказаў Ежы Кішкель. — Гэта таксама добры трэнінг перад далейшым жыццёвым саперніцтвам.

Віншавальныя граматы і словы падзякі атрымалі таксама ўсе настаўнікі, якія падрыхтавалі лаўрэатаў. Прыемна і нам павіншаваць нашых пераможцаў і іх добрых апекуноў!

ЗОРКА
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Міра ЛУКША

Сарокі з Трашчотак

У Трашчотках можна
І сорак сарок налічыць,
Калі б падысці асцярожна
І кожную чымсьці зманіць:
Сарокі любяць у Трашчотках
Як і ў кожнай вёсцы ў нас
Скрасці якую бліскотку
Ды ў гняздо несці ўсё напаказ.
Сарока не супраць паесці
Таго чаго сама не знясла,
А ёсць у гэтай вёсцы што знесці,
Што спрытна свіснуць з сяла.
І ў чым папракнеш тут сароку,
Такая натура ва ўсіх:
Завядзе сваю тут трашчотку
І трашчыць за дзесяцярых!
А калі сорак іх у Трашчотках
Сама менш, бо як сотня трашчаць,
Ты не вер у такую вось плётку,
Бо сарокі ўсе ў Сакі паляцяць.
І не будзе ў Трашчотках сарок!
Вёску кінуць бы так назнарок.
І не хопіць нам сарок-белабок.
І ў Трашчотках — маўчанне і змрок!

За званне лаўрэата змагаліся два гады

Сёлета ў бельскай „тройцы” найбольш лаўрэатаў прадметнага конкурсу па беларускай мове. Так павінна і быць! Чаму? Тут простая матэматыка — у „тройцы” найбольш дзяцей і моладзі вывучае родную мову.

На ўрачыстым падвядзенні конкурсу нам удалося пагутарыць з дзяўчатамі з Бельска-Падляшскага. Усе яны вельмі цешыліся з поспехаў. Аня і Віялета за званне лаўрэата змагаліся два гады. Яны шасцікласніцы і напэўна будуць яшчэ прымаць удзел у такім конкурсе. Вядома, як гімназісткі. Дзяўчаты прымалі яшчэ ўдзел у прадметным конкурсе па прыродзе, а Віялета дадаткова яшчэ па інфарматыцы і перайшла ў другі этап. Наймалодшая з іх, Канстанцыя, пяцікласніца, таму поспех цешыў як ніколі. Дзяўчатак ведаю і ад сустрэч на ўроках беларускай мовы ў іх школе. Яны дэкламатаркі, акцёркі, спявачкі — словам, лідэркі беларушчыны ў сваіх класах. Таму іх поспех у прадметным конкурсе можна ўспрымаць як належную ўзнагароду.

Віялета Маліноўская, Аня Кірылюк, Канстанцыя Дораш

Дзяўчаты кажуць, што падабаецца ім граматыка.

Калі запісваю прозвішчы бяльшчанак, Віялета Маліноўская адзначае:

— Маё імя пішацца праз адно „т”!

Тэкст і фота ЗОРКІ

Вершы Віктара Шведа

Не едзе ў двух напрамках

Паліцыянт машыну
Спыніў, як збаўленне,
Ехала жанчына
Тут супраць цячэння.

— Едуць адным следам,
Ты насупраць, дамка!
— А ці ж я тут еду
Аж у двух напрамках?

ГІСТОРЫЯ ПРА СНЕЖКУ Ў КРАСАВІЦКУЮ НОЧ

Колькі сонца было ў той дзень, калі Ірэнка і Віталік сустрэлі адно аднаго! Была сярэдзіна красавіка. Зялёныя, яркія, каляровыя пырскі так і сыпалі з дрэваў на твары, на рукі, пад ногі. А Віталік, мілы Віталік, не мог адарваць вачэй ад непаседных гарэзаў, што так і наравілі прыляпіцца да шчочак дзяўчыны. Сама Ірэнка, гарэзная, як і тыя зайчыкі, зараз болей за ўсё баялася, што Віталік раптам выпусціць ейную руку са сваёй. Толькі ні за што на свеце ў тым яму не прызналася б. І ўсё было шчыра, цудоўна, сонечна.

Толькі..., толькі ўсё адно нешта не давала дзяўчыне спакою.

Таму, калі настаў цёплы вечар, і надышла немінучая пара развітання, яна раптам сказала:

— Я загадала адно жаданне. Выканаеш?

— Выканаю, — ціха адказаў Віталь, працягла ўглядзеўся ў вочы дзяўчыны.

— Але ты нават не спытаў, якое!

Хлопец толькі ўсміхнуўся; нечаму свайму, патаемнаму, светламу.

— Ідзі спаць, — адказаў ён і ўрэшце павольна выпусціў руку Ірэнкі.

Ён пайшоў, не азіраючыся.

І накрыла зямлю загадкава-моўкная ноч.

А Ірэнцы — калі яна ўрэшце заплюшчыла вочы і праваліцца ў сон — сніўся... белы, бясконцы снегапад. Снег падаў і падаў, сярод вясны, сярод горада. Мёў, віхурыў, накрываў дамы, ахутваў дрэвы, вырастаў бялюткімі купкамі над красавіцкай зялёнай травой. І сярод гэтага снегападу — стаяла Ірэнка. Раскінуўшы рукі, ловячы лёгкія снежынкі на далоні, верачы і не верачы, што гэтак бывае.

Раптам нехта мільгануў, паказаўся сярод гэтай белай сцяны. „Віталік, гэта ты? Адкуль ты мог ведаць?!” — гукнула ў завіруху яна. Ды толькі лёгкі, чысты смех ветрыку пачуўся ў адказ. Не, яшчэ голас, здаецца... „Хіба трэба аб тым неяк ведаць? Яно проста ёсць..., або — не”.

І болей — болей нічога; і нікога навокал. Толькі бела, бела, бела...

Ірэнка схілілася да зямлі, зляпіла мяккую снежку і — прачнулася. Прачнулася, трымаючы ў руках белую, пухнатую снежку.

Увесь пакой залівала нясцерпнае, сонечнае святло. У акно падміргваў і пяшчотна струменіўся красавік. А ў фатэлі насупраць сядзеў Віталік. Ён моўчкі ўсміхаўся і трымаў у руках такую ж белую, такую ж цёплую снежку.

Ваш Дзядзечка Сід

24 сакавіка 2008 г., Кобрын

Музыка з кайфам

„ZigZag” ам праз жыццё

Можна і зігзагам, можна і напрасткі, як каму выгадней. Гурт „ZigZag” яшчэ да канца не вырашыў куды падацца, па якім шляху ісці, таму і прабуе розных спосабаў, збіраючы, так патрэбны маладым, жыццёвы і творчы вопыт.

У першых словах майго ліста да Вас прызнаюся, што гурту „ZigZag” не слухаю, калі не мушу. Пэўна таму, што іх спалучэнне гітарнага гучання з попстылем мне неяк не падыходзіць. Але пішу пра гурт невыпадкова. Інспірацыяй для гэтага тэксту быў паказ беларускага незалежнага кіно ў Беластоку, на якім я пабачыла кліп да кавера на песню „Танкі” гурту „Нейра Дзюбель”. Аказваецца, што вялікім фанатам „НД” з'яўляецца і лідэр гурту „ZigZag” Ігар Загумёнаў. Гэта не першы кліп у пяцігадовай гісторыі гурту. З самага пачатку яны ведалі, што візуальны бок музычнай дзейнасці гэта не менш важная справа. Таму ўжо з 2003 года іх кліпы можна пабачыць на беларускіх музычных каналах ды ў музычных перадачах. Дэбютным кліпам быў „Кастрычнік”, а „Пабудзі мяне” стаў таксама першым беларускім кліпам, створаным дзякуючы анімацыі 3-D. Яны ўдзельнічаюць таксама ў шматлікіх праектах, прысвечаных іншым гуртам („Depeche Mode”, „Gods Tower”, „Нейра Дзюбель”).

Тое, што вылучае „ZigZag” сярод звычайных гуртоў, якія граюць канцэрты і запісваюць альбомы, гэта заангажаванасць у розныя грамадскія кампаніі, між іншым, міжнародныя, напрыклад, акцыі па забароне супрацьпяхотных мінаў, дзякуючы якім выступілі ў гастрольным туры па Афрыцы (з песняй „Mine-free World”) ці на Кіпры, на канцэрце супраць расізму (з песняй „Song Of The Wave”). Выступаюць яны таксама на рознага віду антыглабальных прэзентацыях. Паводле чутак, гурт мае шанс наведаць усе мірныя акцыі, дзякуючы дапамозе бацькі Ігара, які працуе дыпламатам. Вядома, што нават калі ў плётцы крыху праўды, лепш ёй не верыць, бо самае галоўнае, што беларускія музыкі вядомыя ва ўсім свеце, а беларуская мова, мабыць, запомнілася хаця б аднаму афрыканцу:)

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 16

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 12: Кіт, талент, самалёт, палёт, арак, шэф, блакіт, рай, козыр, клас. Красавік, бэз, запал, мара, талака, далёкі, лёт, сэт, Ас, трафей.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Мірон Марчук** з Белавежы, **Ева Каролька, Анна Карпюк, Анджэліка Сапяжынская, Кася Сэвастыянюк** з Чыжоў.



З аповедаў бабулі Ганусі

Жыд Меёр

Недалёка рэчкі Нарвы, на пясчаным узгорку жыў жыд Меёр. Былі ў яго дзве дачкі і двух сыноў. Дочкі павыходзілі замуж і паехалі ў Амерыку. Сыны таксама пажаніліся і выйшлі з бацькавай хаты. Жонка Меёра была сяброўкай бабулі Ганусі, таму Гануся часта, узяўшы за ручку дачку Ольку, наведвала іхнюю хату. Многа ж чаго цікавага пра жыццё расказваў Меёр. — У нас, — казаў, — жанатыя дзеці не жывуць разам з бацькамі ў адной хаце, як у вас заведзена. Наступяць і ў вас такія часы, калі бацькі застануцца адны.

Прыйшлі немцы, сям'ю Меёра вывезлі ў гета, усе загінулі. Толькі Меёравы дочкі ў Амерыцы асталіся ў жывых. А прароцтва старога яўрэя збылося.

Музыкант у кожнай хаце

У канцы Плёсак жыла адзінокая старэнькая бабуля. Вясковыя дзеці любілі бабулю і часта яе наведвалі. Умела яна цікавыя казкі расказаць, і будучыню прадказаць. „Запомніце, дзеткі. Я ўжо старая, не дачакаюся, а вы, калі пажывеце даўжэй, убачыце: цэлая наша вёска будзе паспаваная павуцінай, у кожнай хаце будзе свой музыкант, а па палях будуць ездзіць жалезныя печы". Як жа гэта магчыма, каб у кожнай хаце быў музыкант? — думалі здзіўленыя дзеткі. Некаторыя з іх дачакаліся — у Плёсках загарэліся электрычныя лямпачкі, вёску паспаялі дратамі, на сценах павесілі „точкі", з якіх у кожнай хаце раздавалася музыка, а на палетках паявіліся трактары. Адкуль старая непісьменная бабуля гэта ведала?

Бруод

Плёскаўскія Пескі ад Мацейкаў аддзяляе брод. Яшчэ шэсцьдзесят год таму быў тут вялікі, глыбокі раўчак. Вясной вады прыбывала, усё было вакол заліта. Зімой пасля асенніх дажджоў вада замярзала і дзеці коўзаліся на самаробных каньках. Тут жа і вялікі гай. Бегалі мы туды па качыныя яйкі, а то і не раз блукалі. Даўно таму, ніхто ўжо гэтага не помніць, людзі хадзілі і ездзілі па вадзе, *убруод*. І хаця пабудавалі масток, назва *бруод* засталася. Пры маладосці бабулі Ганусі хадзілі сюды з кошыкамі лавіць рыбу, якой у раўчаку было ўдоваль. Пры маім дзяцінстве рыбы не было, затое вады хапала. Летам бегалі мы басанож па вадзе, зімой ездзілі на каньках.

Прыйшла меліярацыя, вада ў раўчаку амаль высахла, а ўсе гаі парэзалі. Прапаў рэхат жаб, спеў птушак, прапалі разнакветныя *лонкі*, якія цяпер можам убачыць толькі ў кніжках для дзяцей...

Ніна БРУЧКО

Спыніся... старасць

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

Часта ўспамінаю Аляксандра Харкевіча (1908 года нараджэння) і ягоную светлай памяці жонку Надзею (нарадзілася яна ў 1910 годзе ў Кранштаце) з вёскі Лешукі — бацькоў настаўніка Аляксея Харкевіча. У маладосці Алёша заўсёды запрашаў мяне да сваіх бацькоў на пачастунак пасля беларускіх фэстаў і іншых мерапрыемстваў, якія з моладдзю ладзілі лешуцкія настаўнікі пад кірункам загадчыка мясцовай школы Аляксандра Харкевіча. А колькі тады ў школе было сустрэч з нашымі беларускімі пісьменнікамі, м.інш. з Алесем Барскім і Віктарам Шведам, з журналістамі „Нівы", на якія прыходзілі людзі з навакольных вёсак.

Аляксандр Харкевіч

Алёшаў бацька, Аляксандр Сямёнавіч, з кастрычніка 2002 года пражывае ў Доме міласэрнасці „Самаранін" у Гайнаўцы, які знаходзіцца на ўскраіне горада, у варот Белавежскай пушчы, аколены вянком 200-гадовых дубоў. Раней у гэтых будынках змяшчалася радзільна-гінекалагічнае аддзяленне павятовага шпіталя ў Гайнаўцы. Цяпер зіхацяць яны пасля капітальнага рамонту. У гэтым комплексе будынкаў Дом міласэрнасці „Самаранін" знаходзіцца з 1998 года. Яго заснавальнікам і дырэктарам з'яўляецца настаяцель мясцовага Свята-Троіцкага прыхода а. Міхал Негярэвіч. Першым жыхаром дома стаў тады 48-гадовы Аляксей Мароз. Цяпер у „Самараніне" жыве 30 жанчын і 19 мужчын.

Хаця ў Аляксандра Харкевіча Мафусаілаў век — 17 жніўня споўніцца яму сто гадоў — адчувае ён сябе даволі добра і памяць у яго выдатная.

Я часта, калі іду па вуліцы 3 Мая, заўсёды спаглядаю на дом для састарэлых і ўспамінаю гэтага сціплага, жыццярадаснага беларуса з Лешукоў. І вось нядаўна мы з Алёшам Харкевічам, ягоным сынам, чарговы раз наведалі Аляксандра Сямёнавіча. Гэтым разам я запісаў ягоныя ўспаміны.

У школу Аляксандр Харкевіч хадзіў у Лешуках дзесьці ў 1916-1917 гадах. Школа знаходзілася ў будынку Андрэя Харкевіча („Паўлюшкі" — бо так называлі яго бацьку).

— У школе было нас пад 20 вучняў, — пачынае расказ Аляксандр Харкевіч. — Навучанне адбывалася ад панядзелка да суботы. Настаўніца была з вёскі Лясная, а настаўнік (хіба называўся Алесь Кабаць) — з вёскі Беглюкі, што каля Нараўкі. Навучалі яны нас беларускай і нямецкай мовам ды матэматыцы. Карыстаўся я беларуска-нямецкім слоўнікам, але пазней, падчас нямецкай акупацыі, забралі яго партызаны. У школу хадзіў я адну зіму, а потым вучыўся сам па сабе, чытаў многа кніжак, газет, журналаў, якія пападалі мне ў рукі.

Калі мне быў 21 год, я ажаніўся з Надзеяй Канстанцінаўнай з дому Харкевіч. У нас было 12 гектараў зямлі, у тым ліку 4 га ворнай. Трымалі мы кароў, цялят, каня, авечак, свіней — адным словам усяго патроху. Я займаўся яшчэ пчалаводствам, а жонка — кравецтвам. Дыплом краўчыхі атрымала яна на курсах у Ваўкавыску. Славілася яна таксама як майстрыха па вязанні — вязала не толькі сабе, але і на заказ. Была шчырай прыхаджанкай Стараляўкоўскага прыхода.

Пасля кароткай перадышкі Аляксандр Харкевіч працягвае свае ўспаміны:

— Як мелі прыйсці саветы, то мы, маладыя хлопцы і адна дзяўчына, пайшлі на чыгуначную станцыю ў Нараўку (Плянту) сустракаць іх. Калі прыйшоў эшалон са Свіслачы, то мы іх прывіталі словамі: „Здравствуйте дорогие товарищи!" Нам, маладым, хацелася завязаць размову. Мы іх спыталі: „Товарищи, есть у вас закурить?" Салдаты загадалі мне зняць шапку і насыпалі ў яе махоркі, г.зв. карашкоў. Хоць у нас з курэннем было тугавата, але заўсёды ў нас была папяросная папера, г.зв. бібулка для загортвання махоркі. Мы хацелі бібулкай пачаставаць савецкіх салдат, але яны адмовіліся, тлумачачы, што наша бібулка не падыходзіць да іхняй махоркі, што ў іх свая курыльная папера. Вярнуўшыся ў Лешукі, мы пачаставалі карашкамі вясковых курцоў.

Калі саветы ўсталяваліся, назначылі выбары ў сельсавет у вёсцы Лука. Прыбылі важныя персоны з Беларусі, зрабілі сход. Прадстаўнік з Мінска сказаў сабраным вылучыць самых лепшых вяскоўцаў у дэпутаты. Мы пачалі раіцца між сабою, ведаючы ўжо ў чым справа, і запрапанавалі найбяднейшага ў вёсцы Новіка. Адным словам, каб не быў кулак.

Пры саветах жылося мне цяжкавата, бо былі вялікія падаткі, г.зв. абавязацельствы. Палічылі нас кулакамі і мелі нас вывезці на „белыя мядзведзі", але не паспелі, бо пачалася нямецка-савецкая вайна.

Аляксандр Харкевіч вяртаецца ўспамінамі ў даваенны перыяд і тут жа зараз прыгадвае нямецкую акупацыю:

— Пры Пілсудскім таксама жылося цяжка. Не было дзе падзарабіць. Хадзілі мы на пару тыдняў у Белавежскую пушчу ставіць метры, закінуўшы за спіну сякеру, пілу і мяшок з харчамі. Калі прыйшлі немцы, нашу вёску выселілі ў Беласток. Вывозілі таму, каб партызаны не мелі сувязі з насельніцтвам.

Пры немцах, яшчэ да высялення, непадалёк нашых Лешукоў на апусцелай калёніі засталася студня. Гэта было вельмі добрае месца для самагонаварэння. У вёсцы было некалькі апаратаў і бывала, што на два або і на тры апараты гналі самагонку. Так прабавалі мы пяршак то з аднаго, то з другога апарата, што на нагах цяжка было ўстаяць. А дома пасля гэтага не было нам весела...

Вярнуліся мы дадому з Беласток толькі пасля вайны. І зноў трэба ўсё адбудоўваць з нуля і нанава разжывацца. А дапамогі ніадкуль не было. Адным словам, нялёгка нам жылося, але дзякуй Богу дажываю да сотай гадавіны.

Хачу сказаць яшчэ, што наша сям'я адданая беларускасці. Калі пачала выходзіць „Ніва", мая жонка паехала ў рэдакцыю, каб асцерагчы рэдакцыйны калектыў, што могуць іх пабіць. Так баялася за іх...

Бачу, што Аляксандру Харкевічу хочацца больш і больш расказваць пра перажытае, супастаўляць яго з ідэаламі, якія яго вабілі і якія ў яго жыцці не збыліся, успамінаць нялёгкі, калдобісты жыццёвы шлях, акрашаны хвілінамі радасці.

— Пачынаю прыпамінаць сабе якую песню, мелодыю і тады мая душа спявае і на сэрцы становіцца лёгка. А часам прыходзяць у галаву сумныя, тужлівыя ўспаміны, іншым разам прыгадваецца тое, што радавала. І тады прыходзіць усведамленне, што не ўсё страчана, што наперадзе летнія дзянёчкі, не менш вабныя за тыя, што засталіся далёка ззаду.

На канец размовы я спытаў, ці задаволены ён апекай.

— Маім найлепшым апекуном, — сказаў Аляксандр Харкевіч, — з'яўляецца мой сын Алёша, які жыве ў Гайнаўцы. Ён штодзень, а то і два разы, мяне наведвае, даглядае, дбае, так што пры ім я маладзею. Дзякую яму за сыноўскую апеку. Калі гаварыць пра персанал нашага дома, то наракаць на іх няма за што. Пры нас дактары, прафесійная абслуга. Наведвае нас таксама бацюшка.

Калі я збіраўся да выхаду, Аляксандр Харкевіч загаварыў:

— А помніш, Віктар, як ты прыязджаў у нашу школу, працуючы ў БГКТ у Беластоку, з кінаперасоўкай. З рускімі і беларускімі кінафільмамі. Помніш фільм „Чырвонае лісце"?

— Помню, паважаны Аляксандр Сямёнавіч, помню. Нам трэба ўсё помніць і даражыць усім сваім, беларускім, родным...

У ходзе сустрэчы я пабачыў у вачах Аляксандра Харкевіча, што яму хочацца расказаць паболей, а для гэтага патрэба часу. Пачакай, спыніся... старасць! — хочацца сказаць у гэтым выпадку.

Падзякаваў я Аляксандру Харкевічу за расказ, пажадаў яму ў добрым здароўі і ў бадзёрым настроі сустрэць 100-гадовы юбілей. Перадаў я юбілейныя віншаванні ад д-ра інж. Лявона Васько з Кашаліна, якога ў 1932 годзе хрысцілі юбіляр. А хроснік пажадаў яму здароўя, радасці і ўсмешкі.

Магільні кіеўскіх князёў XII стагоддзя

Ну вось, мы можам ужо сказаць, што пераступілі высокі для кожнага даследчыка парог самага важнага для нашых зямель адкрыцця.

Нашыя словы смелыя: знойдзены магільні кіеўскіх князёў XII стагоддзя!

Вядома, гэта пакуль высунутая гіпотэза. У які спосаб мы да яе даходзім?

Гісторыя Давыд-Гарадка расплываецца ў сівой імгле стагоддзяў. Гісторыю нашай зямлі мы ведаем пераважна ў часы Вялікага княства Літоўскага, хоць і там многа прабелаў.

Гэта князі

Некаторы гісторыкі, а следам іх Кіркор, пацвярджаюць у выдадзенай у 1882 годзе *Живописной России* факт існавання легенды, паводле якой Давыд-Гарадок заснавалі яцвягі, а горад назвалі ад імя іх князя Давыда, якія прыняў хрысціянскую веру. Вядома, найперш ён мусіў пабудаваць замак; валадарства князёў заўсёды абапіралася на замкі, вакол якіх сяліліся людзі і ўзнікалі гарадзішчы.

Ці можам мы высунуць гіпотэзу, што адкапаныя труны паходзяць з таго часу?

— Не, — кажа пан Антон Луцкевіч, — мы былі на месцы і самі бачылі. Адно, што сёння мы можам бясспрэчна сцвердзіць, гэта тое, што знаходка прыналежыць хрысціянскаму перыяду; яцвягі, як вядома, былі язычнікамі, праўда, іх паасобныя князі маглі ахрысціцца. Таму трэба глядзець далей, у ранейшыя стагоддзі. Паводле мяне, у часы, калі Давыд-Гарадок меў важнае палітычна-вайсковае значэнне. У іншым выпадку княжая сям'я не пражывала б пастаянна на замку, хутчэй яна заглядала б сюды часова і напэўна не аставіла б там сваіх грабніц. Ды хто яшчэ ў той час мог быць пахаваны ў спецыяльных склепах, у такіх трывалых трунах ці ў такіх туфлях, шытых на адну моду, у якіх хутчэй чым па палескай гразі хадзілі па замкавых пакоях? Гэта былі князі!

Калі Кіеў саперничаў з Полацкам

Як адзначае ў *Лекциях по истории западной России* ад 1864 года Каяловіч, які падрабязна разглядае перыяд панавання кіеўскіх князёў, існавала спаборніцтва між Кіевам і Полацкам. Кіеўскія князі садзілі на Прыпяці сваіх родзічаў. Прыпяць была важным водным шляхам, яна з'яўлялася выхадной брамай на Полацкія землі, ды разам з Палескімі балотамі паспяхова загараджала доступ на сваю тэрыторыю. Замкі падобнага тыпу знаходзіліся ў Чарнобылі, Тураве, далей у Слоніме, Ваўкавыску, ды аж у Гародні, а самым важным быў менавіта замак у Давыд-Гарадку. Ключ да пазнейшай Белай і Чырвонай Русі. Час найбольшага росквіту прыпадае больш-менш на XII стагоддзе.

Хто тады панаваў на Палессі, у канкрэтнасці ў Давыд-Гарадку, піша Доўнар-Запольскі ў сваім *Очерке истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия*. Тады наступіў значны падзел Тураўска-Пінскага княства на паасобныя замкі, хоць усе яны выводзіліся ад кіеўскіх князёў.

Трэба спадзявацца што ў Давыд-Гарадку знойдзены менавіта іх грабніцы і там спачываюць іх астанкі.

Несустраканы кшталт трунаў

— Чаму, аднак, не можам гаварыць тут пра самы ранні перыяд ВКЛ?

— Цалкам слушнае пытанне, — кажа пан Луцкевіч, — на гэты час таксама прыпадае вялікая актыўнасць Давыд-Гарадка. У асноўным, гэта абарона ад татараў. Мы бачылі, якія там жывыя татарскія традыцыі: „Татарская гара", „Татарская даліна" і г.д. Магло і так быць, аднак...

Мы бярэм у рукі аловак ды прыводзім дэталі, састаўляем іх і прыгадваем тое, што самі пабачылі ў Давыд-Гарадку.

Першая справа — вялікае напластаванне зямлі. Столькі яе там нанеслі. Для гэтага патрэбны час. Многа часу. Ну і прымітывізм самога пахавання. Нідзе там няма слядоў пілы. Дзерава, клёцы, дошкі, іх не пілавалі. І чаму няма жалеза! Відаць, жалеза тады яшчэ было вельмі дарагое, бо карысталіся толькі дзеравам, нават гвазды там не жалезныя, толькі драўляныя.

На даўнія стагоддзі паказваюць яшчэ дзве рэчы: паўсюдна знойдзеныя там вырабы з косці, гаршкі з гліны, яны хоць зляплены ўжо на ганчарскім коле, аднак няма яшчэ эмалі і арнаментыкі.

Урэшце і тыя грабніцы. Належыць сцвердзіць факт, што труны такога кшталту ў нас не сустракаліся.

Ці не былі спустошаны магілы?

На жаль, пакуль мы не ў змозе ўсяго сказаць. Неабходна было б параўнаць знойдзеныя труны з кіеўскімі раскопкамі. Пакуль у нас няма параўнальнага матэрыялу. Няма тут найменшых сумненняў, што далейшыя даследы маглі б спрычыніцца да іншых бясцэнных знаходак. Зараз мы стаім перад загадкай: чаму ў трунах няма нічога з металу, і ўвогуле, чаму няма ніякіх прадметаў?

Звычайных жыхароў не хавалі ў такіх туфлях! Ды нават, каб яны былі імі, там жа павінны знайсці нейкую аграфку, шпільку, клямар, спражку, проста што-колечы! А няма. І гэта князі. Іх шкілеты рассыпаліся. Зараз нам цяжка вызначыць ці іх раней не раскінулі. Здаецца, найбольш верагодная версія такая: гэтыя магільні былі ўжо раней спустошаны. Калі так — узнікае пытанне: хто гэта зрабіў? Толькі далейшыя даследы дапамогуць нам высветліць і паказаць праўду.

Не хапае грошай

Кіеўскія князі XII стагоддзя. У гэтым сказе ёсць нешта з гістарычнай паэзіі, не адно з гісторыі — навукі самой па сабе. Дабытыя сёння на святло восеньскага дня! Такія адкрыцці не бываюць часта. Мы гаварылі шаноўнаму айцу благачыннаму Аляксандру Бяляеву:

— Ксёндз дэкан павінен пабудаваць склеп пад новай царквой і паставіць у ім княжыя труны. Ім жа належыцца годны спачын. І хай прыязджаюць да вас турысты і паломнікі, хай на ўласныя вочы пабачаць, якая старажытная культура і гісторыя Давыд-Гарадка. Хай урэшце астаўляюць тут свае грошы. Мы гаварылі: а які атрымаецца з гэтага фенаменальны чыннік для людзей, для тых, што шукаюць годных пабачэння рэчаў!

— А дзе там! — кажа, — няма грошай на склеп...

Тады мы пытаем — а куды падзеліся нацыянальныя фонды культуры!? Дастаткова на валакіту па Андах для некалькіх басалыгаў, пра якіх расіяне кажуць, што *с жиру бесятся*! І куды пахаваліся нашы паны рэстаўратары? Даследчыкі, які атрымліваюць казённы аклад, захавальнікі музейных фондаў?

Людзі добрай волі і людзі, якія абыякава ставяцца да справы

Прашу прабачэння, што прыводжу тут прозвішчы, але ёсць у такім Давыд-Гарадку пан натарыус Альфонс Тускевіч. Ён з раніцы да вечара зароблены як конь у сваім офісе, асоба, можна сказаць, для нас пастаронняя, а вось, у свабодны час ён даследуе мінулае, штудзіруе, робіць што можа. Хто ведае, ці гэта не яму мы абавязаны ўдзячнасць за тое, што паставіў „крыжык", і вестка пра раскопкі дайшла да прэсы. Інфармацыя ўжо не загіне. Бо калі б не ён, і калі б не кіраўнік школы, яшчэ двух, трох людзей...

Ды што тут зробіш? Гэта не яны нясуць адказнасць за ўсю справу, не яны, добрасумленныя людзі, толькі людзі абавязку, тыя, што сядзяць на адпаведных пасадах і бяруць за гэта дзяржаўныя грошы. Нашы „постэрункі" — як пафасна называюць іх на развітальных банкетах. Час, каб зышлі яны са сваіх „постэрункаў" і ўзяліся за справу.

У Давыд-Гарадку здзейснілася важная і знамянальная для культуры і гісторыі краіны справа. Яна не можа пайсці ў забыццё!

„Słowo", 1936, nr 306 (7 кастрычнік), Вільня.

Юзэф МАЦКЕВІЧ,
пераклад з польскай мовы
Г. Кандрацюк

УНІВЕРСІТЭТ імя Мікалая Каперніка ў Торуні

Інстытут міжнародных адносін
*
Кафедра этналогіі ды культурнай антрапалогіі
*
Навуковае кола студэнтаў этналогіі
*
Універсітэцкае навуковае кола аматараў Украінных зямель
*
Інтэрдысцыплінарнае навуковае кола аспірантаў

запрашаюць

на агульнапольскую шматпрадметную навуковую канферэнцыю студэнтаў і аспірантаў

Беларусь — сучаснасць і гістарычна-культурныя кантэксты

29 траўня 2008 г.
Instytut Stosunków Międzynarodowych UMK, ul. Batorego 39 L, 87-100 Toruń

У канферэнцыі шматпрадметны характар і з'яўляецца яна часткай арганізаванага ў днях 29-30 траўня 2008 г. беларускага мерапрыемства. У яго рамках, акрамя навуковага боку, будзе можна пачуць беларускую музыку, паглядзець фільмы на беларускую тэму, а перш за ўсё сустрэць маладых людзей, якім Беларусь і беларускасць з'яўляюцца блізкімі.

Асаблівая мэта канферэнцыі гэта закрануць пытанні на тэмы гісторыі, літаратуры, мастацкіх ды філасофскіх твораў. Цікавіць нас, таксама, з'ява рэцэпцыі культуры насельніцтвам ці ягонымі часткамі, так масавай, як і „высокай". Арганізатары хацелі б паказаць шматлікія аспекты важныя ў перспектыве сённяшняй Беларусі, напрыклад, прысутнасць ці адсутнасць некаторых тэм у сродках масавай інфармацыі і ў міжнароднай сферы, грамадскія незалежныя ініцыятывы, якія ўплываюць на кшталт рэгіёнаў ці асяроддзяў.

Аблічча Беларусі, якое ведаем са штодзённых газет і інфармацыі, мы хацелі б адкласці далёка, а шырэй заняцца малавядомымі праблемамі — яны ж істотныя, сапраўдныя.

Запрашаем студэнтаў і аспірантаў усіх універсітэцкіх спецыяльнасцей. Выступ павінен змясціцца ў 20 хвілінах. Шчыра пажаданыя мультымедыйныя паказы. Заявы арганізатары прымаюць да **30 красавіка 2008 г.** У заяве (максімальна 1 старонка фармату А4, шрыфт 12 Times) павінны знаходзіцца таксама асабістыя даныя (імя, прозвішча, нумар тэлефона, э-мэйл, установа, якую студэнт прадстаўляе, загаловак выступлення і ягонае рэзюмэ). Далейшыя інфармацыі і заявы па адрасе: tomaszbl@doktorant.umk.pl.

У выпадку большай колькасці кандыдатаў, арганізатары пакідаюць за сабой права на выбар прапанаваных тэм. Канчатковыя пастановы будуць прыняты **5 траўня 2008 г.** Найлепшыя рэфераты арганізатары накіруюць у друк у торуньскія студэнцкія ды аспіранцкія часопісы.

Сардэчна запрашаем!
Ад імя арганізатараў
магістр Тамаш БЛАШЧАК

Хведару Нюньку — 80!

Алесь АДАМКОВІЧ

Як жыць, дык жыць для Беларусі.
А без яе навошта жыць?
Ларыса Геніюш

Так кораценька можна ахарактарызаваць асобу старшыні Таварыства беларускай культуры ў Літве, чальца Прэзідыума Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Хведара Нюньку, якому 6 красавіка споўнілася 80 гадоў.

Амаль два дзесяцігоддзі ён прадстаўляе беларускую грамадскасць Літвы. Дзякуючы яго энтузіязму, адданасці Беларусі, у сённяшняй Літве ведаюць і аб беларусах, і аб іх праблемах.

Адзначыць юбілей гэтага шаноўнага чалавека і раздзяліць з ім ягоную радасць прыйшло блізу ста чалавек. Гэтым і было засведчана наколькі ён паважаны ў грамадстве.

Хведара Нюньку ведаюць і паважаюць не толькі сярод беларусаў свету, але і сярод літоўцаў. Гэта пацвярджаецца тым, што віншаванні ён атрымаў ад галавы кабінета ўрада Літоўскай Рэспублікі прэм'ер-міністра Гедымінаса Кіркіласа, ад спікера Сойма ЛР Чэславаса Юршэнаса і ад іншых устаноў Рэспублікі.

Хвалюючым момантам для ўсіх быў той, калі павіншаваць прыйшлі прафесар-дэпутат Вітаўтас Ландсбергіс і дэпутат Еўрапарламента Лайма Андрыкене, зазначыўшы тым самым павагу да Юбіляра. Былі, між іншым, і чальцы літоўскага Сойма. Ад Дэпартамента нацыянальных меншасцей Юбіляр атрымаў залаты медаль, які ўручаецца толькі надзвычай заслужаным сябрам.

Юбіляра віншуе прафесар Вітаўтас Ландсбергіс

Далей яго віталі шматлікія госці, прыбыўшыя на юбілей з розных куткоў зямлі. Варта адзначыць, што сярод іх былі акадэмікі Радзім Гарэцкі і Анатоль Грыцкевіч, пісьменнікі Вольга Іпатава і Генадзь Бураўкін, старшыня Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына" Алена Макоўская, старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў, старшыня Беларускага народнага фронту Лявон Баршчэўскі, дырэктар зачыненага Беларускага ліцэя Уладзімір Колас, прафесар Юры Бандажэўскі і шмат іншых вядомых і паважаных людзей. З Прагі прывітаў Юрка Станкевіч, з Беластока — рэдактар беларускай газеты „Ніва" Яўген Вапа.

З юбілеем прывітала і прэзідэнт Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвіла.

* * *

Ідзе гісторыя, але застаюцца людзі, якія яе тварылі. Так вось і тут, у Літве, немагчыма ўявіць беларускае жыццё без Хведара Нюнькі. І менавіта 80-гадовы юбілей гэта пацвердзіў. І як адзначалі шаноўныя прамоўцы, што суседзяў не выбіраюць, рэаліі дыктуюць, што ім трэба жыць побач. Але пэўны народ, нацыя многімі ўспрымаюцца цераз нейкую асобу. І вось, ведаючы і гледзячы на Хведара Нюньку, літоўцам можна толькі пазайздросціць, што ім Богам дадзена магчымасць пад бокам мець такіх суседзяў, як шаноўны Юбіляр.

Нягледзячы на свае 80 (а хіба гэта шмат, гэта толькі імгненне: у рэшце рэшт чалавек і яго жыццё вымяраецца не каляндарнымі гадамі, а гадамі ў яго душы, якія зачастую бягуць іначай) спадар Хведар і сёння выглядае маладым, жыццярадасным, поўным энтузіязму, а галоўнае — надзеі і тае надзеі, што чарговы юбілей давядзецца адзначаць у вольнай і дэмакратычнай Беларусі. І гэта зазначалі як шаноўны Юбіляр, так і госці.

Хацелася б далучыцца да ўсіх віншаванняў ды сказаных слоў і толькі напрыканцы зазначыць, што я маю гонар быць асабіста знаёмым з Хведарам Нюнькам.

Апошнія падзеі ў беларускім літаратурным жыцці могуць выклікаць толькі роспач. Са школьных праграм выключаны такія майстры пяра як Наталля Арсеннева, Ларыса Геніюш і некаторыя іншыя. Лукашэнкаўскія ўлады палічылі іх „нацыяналістамі". Хай гэта застанецца на іх сумленні — гарбатага, як кажуць, можа толькі магіла выправіць. Для тых, каго хвалюе лёс Беларусі, яе сапраўдная, а не прыдворная, літаратура, думаю, неяк можна перажыць такую непрыемнасць. І тут ва многім дапаможа Саюз беларускіх пісьменнікаў, сайт якога надоечы з'явіўся ў інтэрнэце.

Калі цікаўны інтэрнэт-карыстальнік ці аматар беларускай літарутуры набярэ на сваім камп'ютэры адрас http://www.litbel.org, то перад яго вачыма адкрыецца прыемнага выгляду выяўленне, якое аздабляе бел-чырвона-белая стужка і Пегас. Гэта галоўная старонка сайта арганізацыі, пра якую мы можам больш падрабязна даведацца, зайшоўшы ў раздзел „Гісторыя", што месціцца крыху ніжэй загалоўка. „Саюз беларускіх пісьменнікаў, — пішуць пра сябе літаратары, — самая сталая творчая арганізацыя Беларусі (гады заснавання — 1933-1934). Яе ранейшая назва — Саюз пісьменнікаў БССР і Саюз беларускіх пісьменнікаў. Прафесійная, добраахвотная няўрадавая грамадская арганізацыя беларускіх пісьменнікў актыўна ўдзельнічае ў грамадскім і культурным жыцці Рэспублікі Беларусь, спрыяе развіццю і прапагандзе беларускай літаратуры і мовы. Саюз пісьменнікаў створаны з мэтамі абароны творчых правоў, прафесійных і сацыяльных інтарэсаў літаратараў, забеспячэння ўмоў для практычнай рэалізацыі свабоды слова і друку, аховы творчай спадчыны".

Варта адзначыць, што пры лукашэнкаўскай уладзе СБП перажывае далёка не лепшыя часы свайго існавання. Яго ўжо выкідвалі з памяшканняў, адбіралі выданні, спрабавалі закрыць на нібыта законных падставах. Сёння Саюз беларускіх пісьменнікаў, нягледзячы на такія цкаванні, працягвае сваё жыццё. „Цяпер у СБП уваходзіць больш за 550 сябраў, членства ў арганізацыі пастаянна пашыраецца з ліку тых літаратараў, якія шчыра рупяцца пра лёс бацькаўшчыны і нацыянальнай літаратуры і культуры. За мінулыя чатыры гады ў секцыі прозы, паэзіі і крытыкі паступіла больш за 300 заяў ад літаратараў аб прыёме ў Саюз. Больш за 120 заяў былі задаволены прыёмнымі камісіямі, у склад якіх уваходзяць самыя вядомыя пісьменнікі Беларусі", — з гонарам распавядаюць пра сябе беларускія літаратары.

Што ж тычыцца непасрэдна сайта, то на ім пакуль многа недапрацаванага. Але гэтая хіба, пэўна, хутка будзе выпраўлена. „Пачалася праца над старонкай «Сябры», якая стане энцыклапедыяй сучаснай беларускай літаратуры. Старонка «Постаці» прысвячаецца тым сябрам пісьменніцкай арганізацыі, якія пакінулі гэты свет. На старонцы «Бібліятэка» плануецца прадставіць электронныя версіі ўсіх кніг, якія прапанаваныя аўтарамі", — распавёў у інтэрв'ю агенцтву „Беларускія навіны" старшыня СБП Алесь Пашкевіч.

Варта дадаць, што на сайце ўжо працуюць рубрыкі „Навіны" і „Выданні". У апошняй месцяцца PDF-версіі незалежнага літаратурнага часопіса „Дзеяслоў" і „Літаратурнай Беларусі" — штомесячнага дадатку да тыднёвіка „Новы час"

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Пачалі са скандалу

6 красавіка ўзяў старт чарговы, ужо васемнаццаты, чэмпіянат Беларусі па футболе. Яго пачатку папярэднічала шырокая дыскусія наконт колькасці каманд у мацнейшым дывізіёне краіны. Ледзь не дайшло да абсурднага — кіраўніцтва футбольнай федэрацыі спярша прапаноўвала пачаць першынство, а наконт скарачэння лігі вызначыцца па ходзе справы. Аднак пад ціскам журналістаў і грамадскасці рашэнне аб фармаце было прынята ўсё ж напярэдадні старту. Цяпер вядома, што скарачэнне вышэйшай лігі адбудзецца, але расцягнецца па часе. Па выніках сёлетняга чэмпіянату эліта скароціцца на два клубы і паменшыцца да 14 каманд — тры горшыя пяройдуць у першую лігу, а адна падымецца ўгару. Праз год такая ратацыя будзе паўторана. У выніку для чэмпіянату 2010 года атрымаем вышэйшую лігу з 12 клубаў і першую з 20 удзельнікаў.

А пакуль 16 калектываў выйшлі на марафонскую дыстанцыю, якая расцягнецца да лістапада. Удзел у чэмпіянаце бяруць (у парадку леташніх месцаў): БАТЭ (Барысаў), „Гомель", „Шахцёр" (Салігорск), „Тарпеда" (Жодзіна), МТЗ-РІПА (Мінск), „Нёман" (Гродна), „Нафтан" (Наваполацк), „Віцебск", „Дынама" (Мінск), „Смаргонь", „Дарыда" (Ждановічы), „Дынама" (Брэст), „Днепр" і „Савіт" (абодва — Магілёў), „Граніт" (Мікашэвічы), „Лакаматыў" (Мінск). Абсалютнымі дэбютантамі з'яўляюцца „Савіт" і „Граніт". А нязменна ў вышэйшай лізе ад пачатку суверэнітэту выступаюць толькі 5 клубаў — абодва „Дынама", „Нёман", „Днепр" і „Шахцёр".

Не абмінула сусветная тэндэнцыя павелічэння колькасці легіянераў і айчыннае першынство. Усяго ў заяўках беларускіх клубаў налічваецца ажно 81 іншаземец. Сярод іх найбольш прадстаўнікоў блізкага замежжа — Украіны і Расіі — па 25 чалавек, на трэцім месцы ідуць бразільцы — 8. Ёсць у камандах і „дзеці Афрыкі" — выхадцы з Камеруна, Гвінеі, Нігерыі, Габона, Кот д'Івуара. Праўда, бальшыня легіянераў невысокага роўню і значная іх частка адсеецца падчас чэмпіянату.

Галоўнымі прэтэндэнтамі на золата лічацца чэмпіён двух апошніх гадоў БАТЭ, які першы сезон самастойна ўзначальвае зусім малады Віктар Ганчарэнка, „Шахцёр", які апошнія сезоны пад кіраўніцтвам Юрыя Вяргейчыка „не злазіць" з п'едэстала, сталічны МТЗ-РІПА на чале з самым паспяховым беларускім трэнерам Юрыем Пунтусам. За медалі могуць пазмагацца таксама „Гомель" і мінскае „Дынама" (апошняму трэба выпраўляць свае мінулагоднія няўдачы).

У стартавым туры ўжо здарыўся сапраўдны скандал. У матчы БАТЭ — „Дарыда", які хіліўся да нулявой нічыёй, на апошніх хвілінах маладзечанскі арбітр Ігар Крук прызначыў больш чым спрэчны пенальці, які рэалізавалі барысаўцы. Гэты эпізод прывёў да сапраўднага сутыкнення гульцоў каманд. З іншых матчаў варта вылучыць разгром (4:0), які ўчыніў МТЗ брэсцкаму „Дынама". Каманда з горада над Бугам пасля таго, як у мінулым сезоне выйграла Кубак краіны, пайшла ў выразны заняпад. Гродзенскае „дэрбі" „Смаргонь" — „Нёман" (такім яго можна назваць з моцнай нацяжкай, бо ў складах каманд амаль няма мясцовых выхаванцаў) завяршылася баявым парытэтам — 2:2. Наперадзе доўгая турнірная дыстанцыя, а вось Кубак Беларусі падыходзіць да вырашальнай стадыі. У красавіку ў паўфіналах сустрэнуцца БАТЭ з МТЗ і „Шахцёр" з мінскім „Дынама".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Замалёўкі з падарожжа

Добра мець сяброў...

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

На рынак падгаварыў мяне ехаць Міхась, сардэчны калега, з якім мы працавалі на чыгуначнай станцыі. Было 10 сакавіка. Прычапіў сябрук фурманку да трактара, веласіпед мой паклаў на воз і ў кампаніі ягонай жонкі падаліся мы ў Кляшчэлі. З Кузавы выязджалі мы раніцай, бо, як казаў Міхась, перад восьмай трэба было яму заняць чаргу ў гміне і заплаціць падатак.

— Паедзем праз Гарэлі. Лясным паветрам падыхаем і бліжэй будзе, — патлумачыў калега.

Дарогаю гэтай, памятаю, кузаўцы і валяне даўней на кірмаш ездзілі. Колы жалезнякоў гразлі ў пяску і гліністай твані, якая разлівалася перад Высіцькай гарою. Лясніцтва няўгоддзі пасля засадзіла лесам і зараз урочышча парастае буйны маладняк. Сапраўдны вырай для грыбнікоў і звярыны. Некалькі год таму ваўкі ў гушчары развяліся, але паляўнічыя іх прапудзілі.

Мая спадарожніца аказалася гаваркой жанчынай, затым на размове хутка прайшоў час. Скончыўся лес і перад вачыма зарысаваліся перыферыйныя забудовы маёмасці Гольштэйнаў. Некалькі сядзіб прытуліліся да чыгуначнага пуці. Непадалёк пераезда стаяла калісьці казарма, у якой жыў Лойка. Выходзіў ён з-пад Вільні і працаваў у чаромхаўскім дэпо. Бацькі нашы сябравалі з Лойкамі, а іхні сын, Генік, быў маім сардэчным прыяцелем. Калі бацькі памерлі, тады Генік перасяліўся ў Беласток, а „кашарку" разабралі. Праязджаючы побач разбураных збожжавых складоў „пэзэтзэтаў" і забітай дошкамі чыгуначнай станцыі ўспомнілася мне мінулае і сэрца сціснулася да болю. Якая безгаспадарнасць! Помнік даўніны, будынак чыгуначнай станцыі, які памятае бацюшку-імператара, пападае ў руіну. Ніхто за яго не клапоціцца. Непатрэбны ён ні чыгуначным уладам, ні ваяводскаму рэстаўратару. Ды і падарожным карысць ніякая, паколькі дзверы пачакальні забіты бляхай. А што засталося ад збожжавых складоў? Адны ямкі па фундаментах і куча друзу. Яшчэ нядаўна лічыліся яны адным з большых элеватараў у краіне.

Ад чыгуначнай станцыі павярнулі мы на жвіроўку, якая пралягае праз сенажаці. І зноў прыкмеціўся мне „прагрэс" цывілізацыі. Калісьці навокал распасціралася бязмернае мора сакавітай травы. Жывёла чарадой пасвілася на пашы. Зараз сенажаці парастаюць крапівой і пустазеллем, бо нямногія косяць траву. Сена стала ў гаспадарцы непрыдатным...

У мястэчка заехалі мы ад вуліцы Белавежскай. Трактар паставілі непадалёк рынку, каб бліжэй было дабірацца ў цэнтр. Міхась падаўся ў гміну, а мы з ягонай жонкай — на рынак. Кірмаш здаваўся быць невялікім. Па абодвух баках брукаванага пераезда размясціліся прылаўкі. З левага боку латкі з фруктамі, з правага — з рознага віду рэчамі. Яблык шмат было і цэны, як напрадвесні, даступныя — ад двух з паловай да трох злотых — самыя адборныя. За брамай, пры ўваходзе, прыкмеціў я знаёмага агародніка з Маліннік Сцяпана Калішука, які прадаваў кветкі. Прывіталіся мы пасяброўску. У час размовы я перадаў прыяцелю здымкі, якія раней зрабіў, а ён, каб не заставацца ў даўгу, падорыў мне саджанцы цудоўных прымулек.

— У агародчыку пасадзіш, — патлумачыў. — Усё лета будуць цвісці і на наступны год застануцца... — І тут жа калега запытаў: — Скажы, Валодзя, што з Колем Ваўранюком. Ад нейкага часу не бачу яго ў перадачах. Можа перавялі на іншую пасаду?

— Часта за мяжу выязджае, — паясняю сябру. — Можа ў гэтым прычына...

— Калі пабачыш, тады перадай, што мы яго ў Малінніках чакаем. Абяцаў нам гэта...

Развітваюся з агароднікам і падаюся ў канец рынку, дзе збіраюцца земляробы. Цікавілі мяне цэны збожжа і парасят. Пакуль я туды дабраўся, сустрэў яшчэ аднаго малінніцкага калегу, Валодзю Данілюка. З ім я пазнаёміўся ў шасцідзесятых гадах, калі ў Малінніку заязджаў з кінаперасоўкай. І па сённяшні дзень яднае нас сардэчная дружба.

Сцяпан Калішук са сваімі кветкамі

Загаварылі мы з Валодзем пра навінкі і пра мінулыя будні. Цікавіла мяне, напрыклад, як даўней „Ніву" чыталі, калі працаваў ён пісьманосцам, ды хто зараз цікавіцца газетай. І пачуў вось такое.

— У васьмідзесятых і дзевяностых гадах, — заяўляе Данілюк, — падпісчыкамі на „Ніву" былі вучні Пачатковай школы ў Малінніках і Пашкоўшчыне. Нямногія дарослыя падпісваліся, бо дзеткі прыносілі газету дамоў. Зараз у гэтых вёсках ліквідавалі школы, тады і „Нівай" менш цікавяцца. З таго, што мне вядома, „Ніву" купляе наш аднавясковец, які працуе сторажам на Радыё „Рацыя" ды можа яшчэ дзветры асобы.

— А ты як бачыш гэту справу?

— Скажу шчыра, не чытаю. За многа ў ёй „палітыкі" і, на маю думку, непатрэбна сунем нос у чужыя справы. Так многія кажуць... А табе, як прыяцелю, магу цікавую тэму падкінуць, — з хітрынкай прыбавіў Валодзя. — Прыязджай, з чалавекам пагаворыш, здымкі зробіш...

Пра „цікавую тэму" Данілюк напамінаў мне ў мінулым годзе, але дамашнія справы не дазволілі мне сабрацца на чарговыя вандроўкі. Абяцаў я затым Валодзю, што неўзабаве наведаю Маліннікі. Не паспеў я развітацца з малінніцкім калегам, як спаткаў Васю Саўчука з Бельска-Падляшскага. Сябра на рынак прыехаў з сынам. Вася з Апакі выходзіць і займаецца конегадоўляй. Прафесію пераняў ён па бацьку. Зараз з сакрэтамі канявода знаёміць сына. Паколькі мяне абмяжоўваў час і я спяшаўся дамоў, тады прапанаваў апацкаму прыяцелю сустрэцца на ягоным ранча. Ідэя спадабалася сябру (асабліва ягонаму сыну, які даведаўся, што ў „Ніву" хачу пісаць) і абяцаў адгукнуцца.

Набліжалася дзевятая гадзіна. Фурманак з парасятамі і збожжам я не прыкмеціў. Казалі, што парасятак было няшмат, збожжа таксама. Хто першым быў, гэты і купіў. Апошнія вымушаны чакаць наступнага рынку. Гандляры на машынах плацілі па 70 злотых за авёс і ячмень, за пшаніцу 80-90 зл., ды няшмат купілі. Адзін мужык з бульбай стаяў. За мяшочак прасіў дваццаць злотых. Пакупнік яму не трапіўся.

Павярнуў я затым да выхаду, каб дабрацца да Міхасёвай фурманкі. Дамовіліся мы з сябрам вяртацца дамоў пасля дзевятай. А Міхась з жонкаю мяне ўжо чакалі. Пагрузіўся я з роварам на воз і падаліся мы ў Кузаву. Назад вярталіся асфальтавай дарогай побач Рэпчыцкага вадаёма.

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — дацкую прыказку.

1. спорт-мардабой = 4 _ 5 _ 6 _ 32 _;
2. дарога пасярэдзіне вёскі = 44 _ 45 _ 39 _ 41 _47 _ 48 _;
3. вынік вулканізацыі каўчуку = 1 _ 51 _ 54 _ 53 _;
4. Тамаш, паэт-рамантык, філамат (1796-1855) = 49 _ 29 _ 31 _;
5. любіць узяць = 19 _ 8 _ 20 _ 18 _;
6. урачыстая вячэра напярэдадні Каляд = 15 _ 16 _ 46 _ 13 _ 14 _;
7. расліна з макаўкай = 52 _ 35 _ 11 _;
8. мільённая частка кіламетра = 36 _ 12 _ 2 _ 7 _ 37 _ 38 _ 33 _ 43 _;
9. не без добрых людзей = 27_ 34 _ 30 _ 28 _;
10. навука, якая заміж вады карыстаецца H_2O = 22 _ 23 _ 24 _ 21 _ 42 _;
11. верхні слой скуркі цытрусавых пладоў = 17 _ 10 _ 25 _ 9 _ 26 _;
12. паказная раскоша, элегантнасць = 50 _ 3 _ 40 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31	32	33	34	35	36
						37	38	39	40	41	42
43	44	45	46	47	48	49	50	51	52	53	54

Адказ на адгаданку з 11 нумара

Вадалаз, ява, кій, Ірак, хлеў, цокат, лом, Ява, улан, бацыла, яслі, хрэн, Міхась.

Рашэнне: **Вялікіх зайцоў ловяць у малых лясах.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: II kwartał 26 zł. do 5 marca 2008 r; III kwartał 26 zł. do 5 czerwca 2008 r.; IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. II półrocze 52 zł. do 5 czerwca 2008 r. II — IV kwartał 78 zł. do 5 marca 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.
Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52. **Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł. **Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Наклад: 1 740 egz.

У Ляўкове ляпілі „буслініую лапу”

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Ад шасці гадоў у самаўрадавай святліцы ў Старым Ляўкове збіраюцца ўсе пакаленні жыхароў Ляўкоўскага прыхода пячы „буслініую лапу”. Пакуль яшчэ прыйдуць дзеці з бацькамі, пані Валя ўжо рашчыніла цеста на „лапу”, каб паспела яно вырасці ля радыятара.

— У нас, амаль у кожнай хаце пяклі „буслініую лапу”, — кажа Вольга Адамюк з Ахрымоў, якая раней штогод прыязджала на перадвелікодныя сустрэчы ў святліцы. — Пяклі не толькі „лапу”, але і „бароны”. Выносілі тады іх перад хату і спрачаліся чые прыгажэйшыя. А „бароны” пяклі як сімвал, бо калісьці бароны зацягвалі на клуню, каб буслы завяліся. Гэта абазначала шчасце ў гэтай сям'і. Тады ўжо было вядома, што хата напэўна не згарыць.

„Буслініая лапа” гэта таксама сімвал. Буслы, якія прылятаюць, нясуць з сабой шчасце, дабро і вясну, таму „лапу” пяклі перад святам Благавешчання. Яны перад святам, так як яйкі на Вялікдзень, дабравесцяць новае жыццё.

— Я ў пэўным сэнсе рэактывавала старую традыцыю, — распавядае Марыёля-Галена Рэент, кіраўнік святліцы ў Старым Ляўкове. Помню як „буслініую лапу” пякла мая бабуля, але чалавек не пра ўсё помніць у дарослым жыцці. Некаторыя ўспаміны вяртаюцца пазней. Так было і з „лапай”.

У гэтым годзе пані Оля не змагла прыехаць, затое Марыёля папрасіла дапамогі ў спадарыні Валі, якая паходзіць з Семяноўкі, таксама роднай вёскі спадарыні кіраўнік. Там таксама ведаюць пра „лапу”. Але згаданая „буслініая лапа” гэта не адзіная прычына, дзеля якой сустракаюцца ляўкоўцы. Момант сустрэчы невыпадковы: важнае, каб была яна і перад Благавешчаннем, і перад Вербніцай.

— На Вербніцу мы ўпрыгожвалі па тры вербачкі, рабілі кветкі з паперы, — расказвае спадарыні Вольга. — Як ужо асвяцім вербачкі, тады ў хаце кожнага па тры разы штурхалі і казалі: „Вэрба б'е і я б'ю, за тыдзень Вэлікдзень, слухай мамы, слухай таты, будзь здаровы як вада, будзь багаты як зямля”. А пасля клалі вербачкі за ікону і чакалі пакуль першы раз выведуць жывёлу ў поле. Тады зноў гэтымі вербачкамі па тры разы краналі кожную кароўку, цяля.

І ў святліцы ўсе рыхтавалі сабе вербачкі. Перад усім з натуральных матэрыялаў, але таксама захоўваючы традыцыю ўпрыгожвання кветкамі з каляровай паперы. Кожнае дзіця, кожная маці ці бацька выходзілі са сваёй, зробленай уласнаручна вербачкай. На гэтым не канец. Мастацкае ўяўленне Марыёлі Рэент падказала і іншыя спосабы ўпрыгожвання хаты, таму побач вербаў усе плялі з вярбовых ды іншых галінак гэтак званыя „строікі”, якія можна павесіць на дзвярах, на сцяне або пакласці на стол ці акно; мабыць, яны ўжо больш сучасныя, але ўсё роўна зелянеюць сваёй натуральнасцю ды прыгажосцю. Мая крыніца ведаў пра мясцовыя звычаі, Вольга Адамюк, падказвае аднак і іншыя спосабы аздабляння хаты.

— Самае важнае, каб помніць, што ў час посту, — кажа, — з вокнаў, з ложкаў усё скідалі і засцілалі старыя плахты, ставілі кросны. А ўжо ў Вялікі тыдзень кросны выносілі, засцілалі самы прыгожы дыван, мянялі старыя папяровы фіранкі на новыя, з паперы таксама рабілі павука, якога вешалі пад столлю. У хаце пры іконах вешалі нават па тры ручнікі.

Вядома, што сёння амаль ніхто не вышывае ручнікоў, не выконвае фіранак з паперы. Мабыць, проста лягчэй зрабіць колцы з вярбовых галінак. Жырандолі таксама купляем у крамах, а на Вялікдзень калісьці на Ляўкоўшчыне жырандолі ўсе рабілі амаль рытуальна.

— Наўкола лямпы, што вісела пасярэдзіне галоўнага памяшкання, — кажа пані Оля, — рабілі такія вось абажуры. Мачылі лубін і з яго выраблялі аздобы, а тры колцы фармавалі з дроту. Тады на іх нанізвалі намочаную фасолю, а пацеркамі з лубіну спалучалі драцяныя колцы. На іх таксама вешалі фасолю, але на канцах чаплялі хваёвыя шышкі. А на колцы з лубінам таксама нанізвалі каштаны. Тады ўсё фарбавалі на сярэбраны колер, а шышкі на канцах залацілі. Як гэта прыгожа выглядала!

Усю работу ў хаце трэба было закончыць да Чыстага чацвярга, таму і ўдзельнікі сустрэчы ў ляўкоўскай святліцы цешыліся, што вялікую частку працы будуць мець ужо за сабою. Чакаюць гатовыя вербы, аздобы ў хату, але няма велікоднага свята без пісанак ці крашаных яек. Традыцыйна ў Ляўкове фарбавалі яйкі ў цыбульніку, амяле ды дубовай кары. Дзякуючы гэтаму атрымліваліся зусім розныя, але натуральныя колеры. Марыёля Рэент падтрымлівае гэтыя традыцыйныя спосабы, але каб засяродзіць увагу дзяцей, прыдумвае і іншыя метады, выкарыстоўваючы розныя колеры. Сёлета ўсе пабачылі шмат узораў. Між іншым, дзеці малявалі яйкі ў краткі. Не менш цікавым спосабам былі яйкі, завернутыя ў панчоху з прылепленым лісточкам і фарбаваныя ў цыбульніку. Побач кухні, дзе адбывалася маляванне яек, у малым пакойчыку сядзела Каміла, дзяўчына, якая ўсю сустрэчу выскрэбвала ўзоры на раней падрыхтаваных яйках. Перш за ўсё рабіла іх сабе, але адначасова паказвала дзецям, што яшчэ можна зрабіць з велікодным яйкам.

— Гэта дасканалы момант, каб займацца падрыхтоўкай да Вялікадня. Неза рана і неза позна, — кажа адна з мамаў, якая па чарзе рыхтавала сабе ўсе магчымыя элементы, патрэбныя для таго, каб свята сапраўды адчувалася ў хаце. — Я прыязджаю да Марыёлі кожны год, заўсёды чагосьці новага тут даведаемся, штосьці цікавае зробім. І дзецям ад гэтага вялікая прыемнасць — самастойна нешта падрыхтаваць.

Сёлета не было, здаецца, толькі воску. Бацькі прыводзяць штораз меншых дзяцей і з агнём гуляць тут не так бяспечна. Кампенсуюць сабе гэта дзеці апошняй падзеяй велікодных заняткаў. Пакуль усе ўпрыгожылі сабе вербачкі, вырасла цеста на „буслініую лапу”, і тады ўсе дзеці ўзяліся ляпіць „лапы” і „бароны”. Гульні пры тым шмат, а і смак печаных „лапак” неабыякавы. А ляпіць у Ляўкове ўмеюць, гэта ж адно з папулярнейшых месцаў, нават можна сказаць ужо ў Еўропе, дзе лепяць з гліны. У цагельні выпальваюць цэглы, а ў самаўрадавай святліцы лепяць цуды.

20.04 — 26.04

(22.03. — 20.04.) Можаш быць залішне патрабавальны да партнёра. Не навязвай яму сваёй волі, гнеў вылучыць непатрэбныя эмоцыі. Шыкуецца лепшы заробак. Клапатліва зоймешся тымі, каму патрэбна дапамога.

(21.04. — 21.05.) Узмоцненая рашучасць, сіла. Лёгка ажыццявіш усе свае намеры, падпарадкоўваючы сабе іншых. Вырастуць твае патрабаванні адносна партнёра, таксама і цялесныя; можа ў вас дайсці да непаразуменняў, можаш нават шмат страціць. З 23.04. будзеш пабуджаны да бязмежнай і ахвярнай любові.

(22.05. — 22.06.) Пагадзіся з гэтым, што няма ідэальных людзей і нанова ўспрымі свайго партнёра. Не шукай дзірак у цэлым! Шмат выдасі грошай, але і заробкі немалыя. Лёгкае паніжэнне энергіі, страціш ахвоту на паказы.

(23.06. — 23.07.) У каханні адкрыешся на змены. Выберыся з партнёрам на экскурсію ў мілае месца. Схільнасць да бравурнасці, пераборшчвання і паказухі можа прынесці табе насмешку іншых. Старайся не рэалізаваць лішне смелых планаў, каб расчараванне не было надта балючым.

(24.07. — 23.08.) Да 22.04. незвычайныя поспехі на працы, вялікая сіла пераконвання. Кіруйся інтуіцыяй, якая падсуне табе самыя трапныя вырашэнні. Жыццё разнастайнае, раз — поспехі, раз — паразы, ды не рві сабе валос з галавы!

(24.08. — 23.09.) З 25.04. магчымыя клопаты ў падарожжы, лішняя ўражлівасць. Затое ўсё ўдасца ў рэалізацыі планаў. Знакамітая атмасфера ў кампанейскім плане. Старайся з нікім не сапернічаць. Тым, хто будзе выпендрывацца, не заварочвай сабе галавы!

(24.09. — 23.10.) Да 22.04. твая галава з берагамі напоўненая навінкамі, ідэямі, развязкамі. З 23.04. усе рандэву і сустрэчы ў кампаніі будуць надта прыемныя. 21-26.04. Венера не спрыяе ў прафесійных і фінансавых справах. Абдумай кожнае рашэнне і не пхайся туды, куды цябе не просяць.

(24.10. — 22.11.) Да 22.04. працягнецца твой проста неверагодны ўплыў на людзей. Не думай аб змене працы. Ідэальны момант, каб увайсці на новыя пуці! Пазбудзься прыкрых эмоцый, калі нават варта кінуць таго, хто табе шкодзіць!

(23.11. — 22.12.) Старайся не рабіць нічога важнага — будзеш нервовы, пабуджаны, паспешлівы. Празмернасць заняткаў выб'е цябе з каляіны і можаш страціць з вачэй важныя нагоды. Шмат часу страціш на малаважныя прыёмы. Калі дакучае табе язва страўніка ці сэрца — пры да доктара!

(23.12. — 20.01.) Да 22.04. хапае табе сілы і творчасці на цудоўныя рэчы! З 23.04. можаш адчуць сумненні, мець пачуццё змарнаваных шанцаў і кепскаваты настрой. Ненайлепшы час на падарожжы. Не дапускай да зайздрасці паміж сябрамі.

Вадалей (21.01. — 19.02.) 20-24.04. будзеш пад уплывам Марса, таму найважнейшыя для цябе будуць незалежнасць і свабода. Выкарыстаеш адпаведны момант, выкажашся адвагай і вялікай рашучасцю. Адзінокія Вадалеі не будуць рады партнёру, які схоча іх ашчаслівіць сілай.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Зробіш на ўсіх маланкавае ўражанне. Пашчасціцца табе і ў дробных, і ў сур'ёзных справах. Можаш сустрэцца з былым каханнем, пазнаёміцца з незвычайнай асобай. Дагаварыся на працы, каб неўзабаве не папсаваліся адносіны.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960